


Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 КАСТРЫЧНІКА 2015 г. ПЯТНІЦА № 194 (28052) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Твой голас важны для Беларусі!

# САМАЕ ПАЧЭСНАЕ ЗВАННЕ

### Учора ў краіне стартаваў Тыдзень маці

**14 кастрычніка мы ўжо 18-ы раз будзем адзначаць Дзень маці, прымеркаваны да вялікага праваслаўнага свята — Пакрова Прасвятой Багародзіцы. Праграма Тыдня маці ўключае як традыцыйныя мерапрыемствы (урачыстыя прыёмы, акцыі, канцэрты, ушанаванні), так і мерапрыемствы новага фармату (сустрэчы ўсынавіцеляў, выставы-форумы). Яны працягнуцца па 15 кастрычніка. Мерапрыемствы будуць арганізаваны міністэрствамі культуры, інфармацыі, адукацыі, аховы здароўя, унутраных спраў і абароны, органамі ўлады, а таксама «Беларускім саюзам жанчын».**

У нашай культуры здаўна было прынята з павагаю ставіцца да жанчыны-маці. Няпростая праца нашых маці высока цэніцца і на дзяржаўным узроўні. У рэйтынгу краін, спрыяльных для мацярынства і нараджэння дзяцей, Беларусь займае 25-е месца сярод 179 дзяржаў свету. Сярод краін СНД мы знаходзімся на вядучай пазіцыі.

Беларуская сям'я становіцца большай. Так, каля 54% нованароджаных — гэта другія, трэція і наступныя дзеці. Шматдзетных сем'яў у краіне налічваецца больш за 77 тысяч.

Як паведаміў **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК**, у апошнія гады ў нашай краіне забяспечаны рост памераў дапамог па доглядзе дзяцей, уведзены дадатковыя віды матэрыяльнай падтрымкі сем'яў, прадастаўляецца шырокі спектр сацыяльных паслуг. СТАР. 13



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



**Пра асаблівасці «кліпавага» мыслення**
СТАР. 4



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**
**20 КАНАЛАЎ**

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір СЯМАШКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Трэба развівацца інавацыйна-інвестыцыйным шляхам, будаваць інавацыйныя прадпрыемствы — у гэтым наша будучыня. Асабліва маладыя людзі павінны гэта разумець. Мы павінны пастаянна займацца інвестыцыямі і інавацыямі, каб развівацца далей. Беларусь — невялікая краіна, у нас няма вялікіх запасаў выкапняў, мы можам выжыць толькі за кошт уласных мазгоў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 09.10.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17338,00 | ▼ |
| Еўра | 19546,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 277,98 | ▲ |
| Укр. грыўня | 812,94 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Вяртанне страчанага

## САБРАЦЬ МАЗАІКУ НАНОЎ

### Пано «Партызаны» адкрылі пасля рэстаўрацыі

**Мазаіка Аляксандра Кішчанкі, што ўпрыгожвае будынак гасцініцы «Турыст», пачала асыпацца яшчэ ў 1990-х гадах. Прычына — тэхналагічная памылка. Пано размясцілі на нахільнай сцяне. У шчыліны між панэлямі траплялі цёплае паветра і вада, што пакрысе разбурала бетон і выклікала карозію металічнай сеткі. Паўплывала таксама, хоць і ў меншай ступені, блізкасць метро. Вяліся размовы пра тое, каб увогуле прыбраць гэтую мазаіку: аднаўленне дорага абыдзецца. Але ўрэшце сродкі знайшліся. Мастацкі твор, па прапанове адміністрацыі Заводскага раёна, уключылі ў Інвестыцыйную праграму Мінска, і паўтара года таму пачалася рэканструкцыя.**

**Навуковы кіраўнік рэстаўрацыйных работ Аляксандр КЛІМАШОНАК** расказвае, што перш за ўсё яны ўмацавалі сцяну. «Мы выкарыстоўвалі сучасныя матэрыялы, усё праліпілі. Сітуацыя, калі пано зноў стане асыпацца, не павінна паўтарыцца». Сабраць мазаіку было няпроста. Эскіз на кардоне ў натуральную велічыню не захаваўся, прыйшлося аднаўляць карціну па архіўных фотаздымках і самім рысаваць чарцёж. СТАР. 4




Фота Надзеі БУЖАН.

■ Надвор'е

## БЕЗ ДАЖДЖОЎ, ЗАМАРАЗКІ ДА МІНУС 8

**На гэтым тыдні на тэрыторыю Беларусі завітала сур'ёзная хваля холаду. Таму і ў пятніцу ўмовы надвор'я ў нас у асноўным будзе вызначаць зона павышанага атмасфернага ціску, сфарміраваная ў халоднай паветранай масе. Будзе воблачна з праясненнямі і пераважна без ападкаў, паведамляюць спецыялісты Белгідрамецэнтра.**

Будзе ўмераны паўночны вецер. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 3-8 градусаў. Атмасферны ціск на працягу дня істотна не зменіцца. Пад уплывам вобласці павышанага атмасфернага ціску і халодных арктычных паветраных мас захаваецца халоднае надвор'е на тэрыторыі краіны ў суботу і нядзелю. Прагназуецца пераважна без ападкаў. Уначы на большай частцы тэрыторыі замаразкі — 0 — мінус 6 градусаў, а месцамі пахаладае нават да 8 марозу. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе 3-8 цяпла.

У сувязі з рэзкім пахаладаннем і сур'ёзнымі замаразкамі ўначы сіноптыкі аб'явілі аб аранжавым узроўні небяспекі і падрыхтавалі спецыяльнае папярэджанне для работнікаў сельскай гаспадаркі. Спецыялісты настойліва рэкамендуюць не пакідаць адкрытымі выкапаную бульбу і караняплоды.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ДЗЕЛЯ РОДНАЙ КРАІНЫ

## Беларусы сваёй працай і талентам, ініцыятывай і майстэрствам робяць жыццё лепшым, забяспечваючы дабрабыт сваёй Айчыны

**Пра гэта заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод.**

Сярод узнагароджаных — камандзір экіпажа 61-й знішчальнай авіяцыйнай базы Узброеных Сіл Беларусі Уладзімір Паўленка, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. Падчас сітуацыі, якая ўяўляе пагрозу для жыцця людзей, ён адмовіўся ад катапультавання. У вельмі складаных умовах экіпажу ўдалося прадухіліць катастрофу і пасадзіць самалёт на базавым аэрадроме. Уладзімір Паўленка ўзнагароджаны ордэнам «За асабістую мужнасць». Такой жа ўзнагароды ўдастоены начальнік штаба — першы намеснік камандзіра вучэбна-баявой авіяцыйнай эскадрыллі 116-й гвардзейскай штурмавой авіяцыйнай базы Георгій Мішаеў. Быўшы намеснікам камандзіра звяна, ён вывеў у бяспечную зону самалёт, які страціў кіраванне, і на мінімальнай вышыні катапультаваўся, пераканаўшыся, што машына не ўпадзе на жылыя пабудовы.

У наш няпросты час вельмі важна, што ва Узброеных Сілах Беларусі служаць вайскоўцы, здольныя рызыкаваць сабой дзеля выратавання людзей, падкрэсліў Прэзідэнт, заўважыўшы, што абараназдольнасць краіны забяспечвае не толькі моц зброі і ўзровень падрыхтоўкі асабовага складу, але і маральна-этычныя ўстаноўкі салдат і афіцэраў, іх маральныя ідэалы.

У ліку ўзнагароджаных былі прадстаўнікі розных сфер — навукоўцы, будаўнікі, аграрыі, настаўнікі, журналісты. Асобныя словы падзякі прагучалі ў адрас шматдзетных маці, якія выхоўваюць дзяцей. «Асаблівая падзяка за дзетак. Нам так сёння іх не хапае. Я пра гэта часта кажу, — адзначыў Прэзідэнт. — Мы ў будучыні, калі нам з вамі прыйдзецца працаваць, прыярытэтную ўвагу будзем надаваць дзецям і старым. І будзем рабіць усё для іх, наколькі гэта магчыма».

«Калі б не знешнія ўмовы, мы даўно ўжо былі б квітнеючай дзяржавай, — лічыць Прэзідэнт Беларусі. — У нас ёсць чаму павучыцца, і я гэта кажу ўсюды на перагаворах з лідарамі вядучых дзяржаў, калі яны мне пачынаюць намёкамі гаварыць аб нашым дзяржаўным ладзе, аб дэмакратыі, — дай Бог, каб у вас была столькі дэмакратыі. Таму што дэмакратыя — гэта перш за ўсё народ, гэта дзяржава, якая робіць усё ў інтарэсах народа. Там, дзе можна нараджаць, спакойна хадзіць з дзеткамі, адчуваць сябе абароненым, дзе можна дастукацца да ўлады. Я не хачу сказаць, што мы ўсе робім у гэтым кірунку, але дастукацца да самых высокіх узроўняў улады ў нашай краіне можна».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што вельмі многае залежыць таксама ад укладу кожнага ў развіццё і росквіт краіны.

■ Выбары-2015

# Каб не было ціску,

## даныя сацыялагічных апытанняў стануць вядомыя пасля выбараў

**Публікацыя звестак сацапытанняў у той час, калі ідзе датэрміновае галасаванне, з'яўляецца вельмі магутным уплывам на мысленне чалавека. На гэта звярнула ўвагу старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына падчас анлайн-канферэнцыі на сайце Белтэлерадыёкампаніі.**

«Чаму? Таму што людзям уласціва рабіць так, як гэта робіць большасць, — аргументавала яна. — Апублікаваўшы сацыялагічную справаздачу ў той момант, калі выбаршчык рыхтуецца прыйсці на ўчастак, можна значным чынам паўплываць на светапогляд чалавека і яго выбар».

Што да агітацыі, то, упэўнена старшыня Цэнтрвыбаркама, «яна не носіць таталітарнага характару, як сацыялагічныя апытанні». «У адным месцы могуць агітаваць, але большая частка насельніцтва аб гэтым нават не здагадваецца, — адзначыла Лідзія Ярмошына. — Я ўжо не кажу, што агітацыя — гэта ўсяго толькі заклік. А сацыялагічнае апытанне і яго апублікаванне — гэта ўжо як бы вынік, выкананне гэтага прызыву. І я думаю, што яго ўплыў нашмат мацнейшы, чым агітацыя».

### КАМЕНТАРЫЙ ПАРЛАМЕНТАРЫЯ

**Генадзь ГРЫЦКЕВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце:**

— Згодна з артыкулам 46 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь, на працягу апошніх пяці дзён да выбараў не дапускаецца апублікавання вынікаў апытанняў грамадскай думкі, звязаных з выбарамі, прагнозаў іх вынікаў.

Што тычыцца агітацыі, то яна забараняецца ў дзень галасавання. Агітацыйныя друкаваныя матэрыялы, якія раней вывешваліся па-за памяшканнем для галасавання, захоўваюцца на папярэдніх месцах. На самых участках для галасавання стэнды з інфармацыйнымі матэрыяламі пра кандыдатаў, якія былі аформлены яшчэ за два тыдні да выбараў, у дзень выбараў захоўваюцца.

Што тычыцца абмежаванняў пры правядзенні агітацыі, то забараняецца прапаганда вайны, заклікі да гвалтоўнага змянення канстытуцыйнага ладу, парушэння тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі; знявага і паклёп на службовых асоб, кандыдатаў, а таксама заклікі да зрыву, адмены, пераносу тэрміну выбараў, якія прызначаны ў адпаведнасці з законам.

Забараняецца таксама прапаганда сацыяльнай, расавай, нацыянальнай, рэлігійнай або моўнай перавагі, выпуск матэрыялаў, якія выклікаюць нацыянальную або рэлігійную варожасць.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.** *medvedeva@zviazda.by*
**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Актуальнае інтэрв'ю

# МЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ АДЗІНЫМІ І МОЦНЫМІ

**Пра гістарычны аспект сучаснай выбарчай кампаніі «Звязда» пагутарыла з гісторыкам, рэктарам Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Маратам ЖЫЛІНСКІМ.**



## БЕЗ НАДРЫВУ

***— Які настрой у вашых студэнтаў?***

— Добры. У нас добрыя дзеці. Калі з вяртаюся да іх «дзеці», яны заўсёды ўсміхаюцца, але яны ўсе для нас — дзеці.

***— Збіраюцца ўдзельнічаць у выбарах?***

— Ужо ўдзельнічаюць. Мне расказваюць, што яны адэкватна ўспрымаюць сітуацыю. Я прасіў куратараў: размаўляйце са студэнтамі без надрыву, ні ў якім разе не прымушайце, не стаўце ўмоў. Для мяне гэта прынцыпова: удзел у выбарах — грамадзянская пазіцыя кожнага. Сам сказаў дзецям: «Не збіраюся лезці ў душу, але калі мы спасылаемся на заходнія правы і свабоды, то трэба не забываць, што мы самі з'яўляемся носьбітамі грамадзянскіх правоў і свабод. І калі вы жадаеце сябе адчуваць грамадзянамі сваёй краіны, то прыйдзіце на ўчастак і зрабіце выбар. Ніхто вам не стане ўказваць — які».

Папрасіў старшыню ўчастковай выбарчай камісіі правесці экскурсіі для тых, хто прыходзіць галасаваць упершыню: расказаць, хто такія назіральнікі, члены камісіі, якія функцыі ў старшыні, што сабой уяўляе выбарчая сістэма, месца ў ёй прэзідэнцкіх выбараў, як адбываецца тэхналогія падліку галасоў.

***— Самі калі збіраецеся галасаваць?***

— Пасля інтэрв'ю газеце «Звязда». У нядзелю буду на працоўным месцы. Папрасіў быць і прадстаўнікоў рэктарата, кіраўнікоў падраздзяленняў. У гэтым няма нічога надзвычайнага. Прэзідэнцкія выбары — адказны этап у жыцці любой краіны, мы будзем адсочваць інфармацыю, каб быць гатовымі на яе рэагаваць.

***— Такая пільнасць звязаная з тым, што адбылося на Украіне амаль два гады таму?***

— У тым ліку. Мы не ўтойваем гэтага, як не скрываем і таго, што клапоцімся пра бяспеку дзяцей, якія навучаюцца ў акадэміі. Таму лічу, што мне, як кіраўніку прэзідэнцкай навучальнай установы, ляжаць на канапе ў дзень, калі краіна выбірае чалавека, які вызначыць будучыню дзяржавы на наступныя пяць гадоў, будзе неабачліва.

Упэўнены, што 11 кастрычніка ўсё пройдзе спакойна, але нельга цалкам выключыць спробы пэўных дэструктыўных сіл выкарыстаць сітуацыю, таму мы проста павінны быць гатовыя.

## НЕ РЭВАЛЮЦЫЯ

***— У чым прынцыповая розніца паміж Кастрычніцкай рэвалюцыяй 1917 года і падзеямі ва Украіне ў лютым 2014-га?***

— Тое, што адбылося ва Украіне, увогуле рэвалюцыяй назваць нельга. У 1917-м на тэрыторыі Расійскай імперыі склалася рэвалюцыйная сітуацыя: адбываліся не проста пратэсты нейкай групы людзей, але хваляванні народных мас, і рэвалюцыя стала апагеем гэтага хвалявання, калі нізы ўжо не жадалі жыць па-ранейшаму, а вярхі не маглі. Хваляваннямі былі ахоплены не толькі буйныя гарады: Масква, Пецярбург, Кіеў, Мінск, але ўся краіна.

Ва Украіне ў пачатку 2014 года бурліў толькі Кіеў, а ўся астатняя краіна маўкліва чакала, што будзе. Пасля на Майдане прывялі да таго, што адна група алігархаў змянілася іншай групай алігархаў, разам з тым адбылося падзенне пенсій і заробкаў, разбурэнне інфраструктуры. Рэвалюцыя — гэта змена існуючага ладу, ломка дзяржаўнага апарату. Ва Украіне такога няма. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі была абвешчана нацыяналізацыя — у нашых суседзяў тое, што за 20 гадоў не было падзелена, цяпер дзеліцца. На фоне агульнанароднага збяднення некаторыя бізнес-структуры там квітнеюць.

Па сутнасці, там адбыўся экспарт гвалту. Нездарма апошнім часам наш Прэзідэнт кажа пра тое, што мы сведкі падзелу свету. Ёсць тыя, хто хоча, каб ААН працавала па пэўных лякалах. Нагадаем, што Ялцінска-Патсдамская сістэма мірных дамоўленасцяў паміж Рузвельтам (пазней Трумэнам) — Сталіным — Чэрчылем была заснавана на тым, што моцныя гэтага свету з'яўляюцца гарантамі стабільнасці на зямным шары. У савецкі час былі праблемы, але сёння колькасць ваенных канфліктаў значна большая. Наш свет стаў больш дэмакратычным?

Зневажанне Ялцінска-Патсдамскай сістэмы адбылося ў 1999 годзе, калі дэмакратычны свет праігнараваў пасляваенныя дамоўленасці і разбамбіў Югаславію. Як гісторык хачу сказаць, што ўсе сусветныя войны пачыналіся з Балкан. І што ў выніку ўяўляе сабой Сербія, Чарнагорыя, Славенія, Македонія?.. Не выратоўваюць іх ні Еўрасаюз, ні Амерыка.

Ва Украіне адбылася трагедыя, якая стала працягам ланцужка падобных трагедый у шэрагу краін, так званага прыходу туды «дэмакратыі», ад якой людзі бягуць. У Афганістане адбываецца штодня па 20-30 тэрактаў — больш, чым пры талібах. Лівія, Ірак, Сірыя... Усюды насаджаецца свая ідэалогія, парадкі.

Але калі тры гады таму мы думалі, што ўсё гэта робіцца недзе далёка, то цяпер гэтая бяда падышла да нашага парога. А Беларусь у XX стагоддзі перажыла страшныя трагедыі Першай і Другой сусветных войн, наступствы чарнобыльскай катастрофы. Мы настолькі стаміліся ад гэтага, што ўпэўнены — не, нічога падобнага больш на гэтай зямлі паўтарыцца не можа. Але гэта не значыць, што мы не павінны быць гатовымі да выклікаў. Порах трэба трымаць сухім.

## РОЛЯ ЛІДАРА

***— Якая сістэма ўлады больш эфектыўна, на вашу думку, супрацьстаіць выклікам XXI стагоддзя?***

— Мы, беларусы, маем багатую гісторыка-культурную спадчыну. Мы з'яўляемся носьбітамі старажытнага дзяржаўнага кіравання з пункту гледжання выканаўчай, заканадаўчай і судовай улады. У нас ужо ў VIII стагоддзі былі формы дзяржаўнай улады, якія насілі пачатак заканадаўчай галіны: веча. Вечавое кіраванне было ў Полацку, Мінску... Веча — гэта сход дарослых жыхароў горада, на якім вырашаліся самыя важныя пытанні ладу горада і дзяржавы. Князь быў гарантам бяспекі і прадстаўніком выканаўчай і судовай улады, і калі на горад нападалі ворагі, то ў дзеянне ўступала моцная ўлада ў асобе князя і яго дружыны. Так было ў Ноўгарадзе, Пскове, так было ва ўсходніх славян. Як толькі ўсталёўваўся мір, веча зноў уступала ў свае правы: заключаліся гандлёвыя і дынастыйныя саюзы, вяліся перамовы. Такім чынам, нашай старажытнай дзяржаўнасці не 200-300 гадоў, а значна больш. Нашы каштоўнасці непараўнальна больш старажытныя, чым тыя, якія нам спрабуюць навязаць. Гэта мы можам павучыць іншых.

З пункту гледжання геастратэгічнага становішча мы знаходзіліся і знаходзімся ў цэнтры Еўропы і заўсёды былі ў сферы ўвагі як Захаду, так і Усходу. Мы апрыёры рабіліся аб'ектамі агрэсіўных дзеянняў іншых дзяржаў, але ні разу самі беларусы не былі суб'ектамі, ініцыятарамі агрэсіі. Да таго ж, мы дагэтуль не адна вілі дэмаграфічных страт XX стагоддзя: да Вялікай Айчыннай вайны нас было больш за 10 мільёнаў. Усё гэта сёння адлюстроўваецца і ў нашых генах.

Таму, лічу, нам сёння патрэбна моцная ўлада. Як выканаўчая, заканадаўчая, так і судовая. У спалучэнні гэтых трох моцных улад мы здольныя вытрымаць любыя выклікі і развівацца далей. І, на маю думку, моцная і паважаная ўлада можа быць толькі праз моцнага і аўтарытэтнага лідара. Наша сучасная, сапраўдная дзяржаўнасць, якой мы налічваем амаль 25 гадоў, тым не менш, мае тысячагадовыя карані. Мы спадчыннікі сур'ёзнага працэсу кансалідацыі беларускай нацыі, у тым ліку дзяржаўнасці.

Мы гатовы вучыцца лепшаму, але не трэба спяшацца. Паглядзіце, што атрымалася ў нашых суседзяў, дзе не было еднасці трох дзяржаўных галін — карупцыя, перадзел капіталу, разрабаванне народнага набытку. Улада, якая пайшла на змову з дэструктыўным капіталам, нічога не дала народу. Гэта перажывае Украіна, ад гэтага апошнім часам пазбаўляецца Расія і, як вынік, набірае сілу. І чым больш моцнай яна становіцца, тым больш яе крытыкуюць. На маю думку, свет, адыходзячы ад аднапалярнасці, вяртаецца да той схемы, якая стваралася ў 1945 годзе.

## НЕ ПАДДАВАЦЦА НА ПРАВАКАЦЫІ

***— Калі вярнуцца да выбараў лідара, як, на ваш погляд, праходзіць цяперашняя выбарчая кампанія ў нашай краіне?***

— Кампанія праходзіць спакойна, і гэта нармальна. Ніхто не адчувае ніякага ціску. Што тычыцца датэрміновага галасавання, то гэта агульнаеўрапейская практыка. У Швецыі галасуюць за месяц. У многіх краінах практыкуецца галасаванне па пошце, па тэлефоне.

Палітычная барацьба ёсць, палітычныя канкурэнты выстройваюць свае тактыку і стратэгію, выкарыстоўваюць піяр-тэхналогіі, новыя метады, пікеты, лістоўкі, заклікі, імкнуцца паказаць свае перавагі.

У нядзелю 11 кастрычніка, безумоўна, таксама палітычны напал будзе, бо ўсе будуць чакаць вынікаў выбараў. Гэта падобна на тое, як бацькі чакаюць з'яўлення на свет дзіцяці. Людзі хвалююцца, але трэба ўзяць сябе ў рукі і быць мудрымі. Тады ўсё будзе, як кажуць беларусы, добра.

***— Ці не варта нам пераходзіць да больш сучасных формаў галасавання — праз інтэрнэт, скажам?***

— Мы жывём у глабальным свеце і рана або позна да гэтага прыйдзем. Але ўсяму свой час. Старажытныя Грэцыя і Рым праіснавалі больш за 1000 гадоў і доўгі час галасавалі рознымі формамі: ад «хто гучней крыкне» да чорных і белых каменьчыкаў. А мы дагэтуль вывучаем грэчаскае і рымскае правы.

Беларусь — адкрытая краіна, таму ўсе на першы погляд перадавыя рэчы трэба вывучаць, вызначаць іх адмоўныя моманты, мінімізаваць апошнія і выпрацоўваць механізмы выкарыстання самага лепшага. Нельга прымаць усё агулам, не ўзважыўшы «за» і «супраць».

Наша выбарчая сістэма большасці, на мой погляд, аптымальная. Але я не навязваю сваю думку. Галоўнае — жыць з упэўненасцю ў заўтрашнім дні і берагчы тое добрае, што маем.

Мой дзед быў начальнікам шахты ў Данбасе, і падлеткам я ездзіў на летніх канікулах у Аўдзееўку і Макееўку... Дзед не дажыў да падзей 2014 года, але тыя мясціны вельмі мне блізкія. І я, калі бяру сваіх сына і дачку за рукі і іду з імі гуляць па мінскіх вуліцах, міжволі думаю пра тое, што адбываецца на вуліцах майго дзяцінства, што людзі там бачылі смерць ад куль або ад асколка снарада, яны адседжваліся ў сырых падвалах і не ведалі, чым накарміць сваіх дзяцей... Гэта не дробязі. Каб такога не здарылася ў Беларусі, мы павінны быць адзінымі і моцнымі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
*medvedeva@zviazda.by*

■ Права голасу

# «Выбары праходзяць у максімальна дэмакратычных умовах»

**«Звязда» распытала давераных асоб кандыдатаў у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь пра ўмовы і ўражанні ад галоўнай электаральнай кампаніі 2015 года.**



**Алег ГАЙДУКЕВІЧ, давераная асоба кандыдата Сяргея ГАЙДУКЕВІЧА:**

## «Упэўнены, што наша выбарчае заканадаўства дамаглося значнага прагрэсу»

***— Наколькі можна параўнаць сёлетнюю палітычную кампанію з той, што была ў 2010 годзе?***

— Кампанія 2015 года радыкальна адрозніваецца ад усіх прэзідэнцкіх выбараў, якія былі ў краіне. Прычын шмат. Іх можна падзяліць на знешнія і ўнутраныя. Калі ўзяць знешнія, то з моманту выбараў 2010 года ў свеце адбыліся значныя змены. У першую чаргу яны прывялі да нестабільнасці, у тым ліку і ў нашым рэгіёне — і ва Украіне, і ў Еўропе, дзе вострa стаіць праблема з бежанцамі. Эканамічная сітуацыя таксама пагоршылася. Безумоўна, гэта тыя фактары, якія паўплывалі на прэзідэнцкую кампанію.

Унутраныя прычыны заключаюцца ў тым, што беларускае грамадства прайшло пэўны шлях, стала больш сталым. З моманту атрымання незалежнасці нашай краіны грамадзянская супольнасць стала іншай: цяпер людзі больш разбіраюцца ў палітыцы, лепш разумець, чаго яны хочуць, менш прыслухоўваюцца да папулізму.

Наша партыя лічыць, што трэба не разбураць, а ўдасканальваць. У 1991 годзе, калі распаўся Савецкі Саюз, мы атрымалі незалежнасць і змаглі яе захаваць. Заслуга дзейнай улады — у захаванні суверэнітэту. Зараз трэба рухацца далей.

У грамадстве ўжо не прымальныя радыкалізм і рэваліцыі. Радыкальныя палітычныя сілы засталіся за бортам прэзідэнцкай кампаніі, яны нават не змаглі сабраць неабходных 100 тысяч подпісаў.

Гэтыя выбары адрозніваюцца значнай дэмакратызацыяй і лібералізацыяй выбарчага працэсу. Падчас збору подпісаў мы праводзілі пікеты, дзе хацелі. Падчас агітацыі мы таксама адчуваем камфорт. За гэты перыяд мы ўжо раздалі каля 900 тысяч агітацыйных лістовак, правялі каля 1000 пікетаў па ўсёй краіне. Нідзе не было перашкод: ні ў абласных цэнтрах, ні ў малых гарадах.

Яшчэ адзін момант, які хочацца адзначыць, як на гэтых выбарах працуюць журналісты. Такога маштабнага асвятлення палітычнай кампаніі не было ніколі. Кожную раніцу нам тэлефануюць з тэлеканалаў, друкаваных выданняў, цікавяцца, дзе і якія мерапрыемствы праходзяць з удзелам кандыдата ў Прэзідэнты. І мне падабаецца, што асвятляецца ўсё вельмі аб'ектыўна. Няма тэндэнцыйнасці, павялічанай увагі толькі да аднаго кандыдата.

Калі дзейнага Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнку паказваюць па тэлебачанні больш, то мы не бачым тут праблемы. Таму што ён — дзейны Прэзідэнт, і калі ён, напрыклад, выступіў у ААН, то гэта, прабачце, важна для ўсіх, у тым ліку і для нас, для апазіцыйнай палітычнай структуры, таму што гэта падзея сусветнага маштабу. Мы не адчуем у сувязі з гэтым дыскрымінацыі.

Здаровая канкурэнцыя палітычных ідэй садзейнічае развіццю грамадства. Мы ўпэўнены, што пасля выбараў яна застанецца. Больш дыскусій, больш «круглых сталоў», больш тэлевізійных дэбатаў — гэта вельмі важна, таму што ў спрэчцы нараджаецца ісціна, таму што канструктыўны дыялог вядзе да развіцця. Дрэнна, калі ўсе ідуць у адным кірунку і здаецца, што іншых напрамкаў няма. Так быць не павінна.

Не важна, хто пераможа на выбарах, галоўнае, каб была выказана воля народа. Важна, каб той, хто пераможа, пачуў сваіх апанентаў. Яшчэ хацелася б, каб выбары Прэзідэнта сталі сапраўдным святам для людзей. Гэта галоўная палітычная падзея ў жыцці любой краіны, пэўны этап, пасля якога яна павінна зрабіць значны крок наперад.

***— Раскажыце пра свае назіранні ў якасці даверанай асобы.***

— Сустрэчы з выбаршчыкамі і пікеты паказваюць: большасць людзей прыйдзе на выбарчыя ўчасткі. Мы не бачым апатыі, мы бачым, што людзі вельмі жыва цікавяцца выбарамі, разумеюць іх значнасць, таму нават агітаваць за тое, каб толькі прыйшлі галасаваць, няма патрэбы. Але, безумоўна, на кожнай сустрэчы мы нагадваем, што апатыя, абыякавасць загубілі не адну краіну. І агрэсіўная меншасць заўсёды мацнейшая за пасіўную большасць. Мы бачым падзеі ва Украіне, трагічную сітуацыю ў іншых краінах. Каб такога ў нас не адбылося, трэба ўдзельнічаць у выбарах — альтэрнатывы няма. Толькі выбары вызначаюць лёс краіны, толькі яны могуць палепшыць жыццё людзей.

***— У сучасных выбаршчыкаў ёсць асаблівасці?***

— Вырасла цэлае пакаленне маладых людзей, якія нарадзіліся ў незалежнай Беларусі. Яны не жылі ў СССР. Гэтыя людзі — наша будучыня. Усе хочуць жыць у суверэннай краіне. Мы не сустракалі іншых. Яшчэ адна рэч яднае беларусаў — яны цэняць мір, спакой і парадак.



**Генерал-маёр Іван ГАРДЗЕЙЧЫК, давераная асоба кандыдата Аляксандра ЛУКАШЭНКІ:**

## «Сустрэчы з даверанымі асобамі найбольш папулярныя»

***— Якія вашы ўражанні ад антуражу і кампаніі?***

— Аналізуючы тое, з чаго пачыналася незалежная Беларусь у 1990-я гады, лёгка прыйсці да высновы, што зроблена сапраўды шмат. 25 гадоў таму эканоміка краіны была развалена, у крамах немагчыма было свабодна купіць ежу, адбываліся пастаянныя перабоі ў падачы электрычнасці і вады — усіх бед не пералічыш.

20 гадоў — гэта адно імгненне. Мне ў тры разы болей, і зараз я магу за паўтары хвіліны расказаць, што са мной здарылася за гэты тэрмін. Лічыце: паўтары хвіліны на ўсё пражытае жыццё. А ў межах гісторыі 20 гадоў — невялікі прамежак, хранаграфічная мілісекунда. Аднак колькі за гэты час збудавана, адноўлена, выпраўлена! Варта паглядзець навокал і адэкватна ацаніць, у якіх умовах мы жывём. Я, шчыра кажучы, задаволены.

Так, праблемы ёсць, але Беларусь, і гэта самае галоўнае, — самастойная, незалежная дзяржава. Можна скардзіцца на праблемы, але лепш рабіць усё, каб наша краіна заставалася незалежнай, свабоднай і шчаслівай, не ведала вайны і ўзброеных канфліктаў.

***— А што можаце сказаць пра самі выбары ў Беларусі?***

— На мой погляд, яны адкрытыя, празрыстыя і, галоўнае, бесканфліктныя. Усім без перашкод дазваляюць праводзіць пікеты. Гэта не толькі ў дачыненні да нашага кандыдата, але і да іншых. Створаны ўмовы для таго, каб беларусы болей даведаліся пра прэтэндэнтаў на пасаду кіраўніка краіны.

Людзі, як мне бачыцца, у асноўным вызначыліся, за каго аддаць свой голас. Бо разумеюць, што ім трэба для нармальнага жыцця. А трэба, каб свяціла сонца, чуўся радасны смех дзяцей, каб можна было без перашкод працаваць.

***— Якія з форм агітацыі за вашага кандыдата найбольш папулярныя?***

— Сустрэчы з даверанымі асобамі. Людзі на іх ахвотна ідуць, часта задаюць пытанні. Я правёў ужо каля 45 сустрэч, у тым ліку ў працоўных калектывах. Ёсць і такія, хто прыходзіць і заяўляе: «Буду галасаваць за іншага кандыдата ў прэзідэнты». Калі ласка! Я да гэтага стаўлюся спакойна. Паважаю кожнага з кандыдатаў, лічу іх магчымасці роўнымі.

***— Што хвалюе людзей?***

— Шмат пытанняў аб тым, ці будзе павышацца пенсійны цэнз. Ведама, што на постсавецкай прасторы ў Беларусі ён адзін з самых «маладых». Таму тэма актуальная. Хвалююць людзей і пытанні жылля, ЖКГ. Цікавяцца Украінай, колькасцю бежанцаў, якія прыбылі да нас. Тэрмінам службы ў арміі. У апошнія тыдні перачытаў не адзін стос даведак, бо людзям трэба адказваць і дапамагаць. Мала каго цікавіць, што па спецыяльнасці я ваенны. Хаця і пра гэтую сферу пытаюцца. Напрыклад, удзельнікаў ваенных канфліктаў цікавяць і льготы. Мы, па магчымасці, выпраўляем сітуацыю, калі яна таго патрабуе.

***— Якое ў вас уражанне ад настрою выбаршчыкаў?***

— Лічу, што яны ў гэтую кампанію даволі актыўныя і ў большасці сваёй пойдуць галасаваць. Людзі разумеюць, што так яны выбіраюць лёс для краіны, клапоцяцца пра будучыню дзяцей. Людзі жадаюць паляпшаць сваё жыццё. Яны даволі цвяроза ацэньваюць кандыдатаў і іх магчымасці.

***— Што вы думаеце пра дзеянні апазіцыі?***

— Думаю, апазіцыя таксама адэкватна ацэньвае, што людзям неабходна спакойнае жыццё, магчымасці працаваць і гадаваць дзяцей.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** yushkevich@zviazda.by
**Вераніка ПУСТАВІТ.** pustavit@zviazda.by ■

# ЧАС. ПЕРШЫЯ РУКІ

## Нобелеўская прэмія для Беларусі: спачатку было Слова

**І гэта было слова пісьменніцы Святланы Алексіевіч. І слова было пра нас. І тэмы для яе даваў той народ, часткай якога яна з'яўляецца. Першая ў гісторыі Беларусі Нобелеўская прэмія аддадзена пісьменніцы нават не за адзін канкрэтны твор, а фактычна за ўсе кнігі, якія створаны да 2015 года. Паказальная фармулёўка: «За яе шматгалосую творчасць — помнік пакутам і мужнасці ў наш час».**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фармулёўка, якая дазваляе меркаваць, што гэта прэмія сапраўды (і ў тым ліку) для Беларусі, якой вельмі шмат у творах пісьменніцы. Не проста шмат. Яна там — уся. Розная. Розных часоў. І з усімі драмамі і трагедыямі, якіх за XX стагоддзе праз адну тэрыторыю прайшло столькі, што наш народ набыў унікальны вопыт аднаўлення і выжывальнасці. Вопыт, у якім даводзілася не проста перажываць, а з болем вырываць з памяці ці сэрца ўспаміны, каб дараваць ці прасіць даравання, асэнсаваць і не вяртацца ў тупік, знайсці сілы ісці далей. Вопыт, які паказаў: чалавек павінен захаваць у сабе чалавечае і насамрэч у яго ёсць для гэтага невераготныя ўнутраныя рэсурсы. Толькі трэба быць шчырым з сабой, назваць рэчы сваімі імёнамі, тады будзе зразумела, што каштоўнае, а што не, і яго можна смела адкінуць. Творы Алексіевіч дапамагаюць — яны спавядальныя. Дакументальная аснова, рэальныя людзі (яна зразумела, што кожны, нават маленькі, чалавек каштоўны, можа быць тады, калі пасля заканчэння факультэта журналістыкі БДУ папрацавала ў раёнках, пабачыла, як жывуць людзі, спрабавала зразумець, чаму так). Гісторыі, якія прыйшлі ў кнігі і паказалі: што яшчэ тут дадумваць і ў які ўласны вобраз ствараць, калі ўсё кажа само жыццё? А кніга — яго люстэрка.

Рэальныя лёсы далі магчымасць не проста суперажываць, а перажыць усё разам з героямі. Ці то вайну разам з гераінямі кнігі «У вайны не жаночае аблічча» альбо дзецьмі таго часу — «Апошнімі сведкамі» жудасцяў Другой сусветнай, калі трэба было абараніць сябе і выжыць. Ці то шок ад таго, што можна было стаць удзельнікам чужой вайны, як гэта здарылася з «Цынкавымі хлопчыкамі» ў Афганістане. І нават вайна, якой у нас не было — але выбухнуў мірны атам — пакінула свае адбіткі на Беларусі, дзе ўжо тры дзесяцігоддзі шмат сем'яў узносяць сваю «Чарнобыльскую малітву», якую нібыта падслухала, занатавала Алексіевіч. І нават больш: нібыта прагучала малітва Беларусі за чалавецтва, якое не прыйшло да разумення, што свет пасля Чарнобыля стаў іншым, і, можа быць, трэба зразумець, што не варта выбіраць шлях самазабойства ці самазнішчэння як асобам, так і народам, наогул чалавечай культуры. Алексіевіч нібыта ўвесь час скіравана ў свет — папярэджвала яго праз досвед Беларусі. І нават у такой кнізе як «Час second-hand» (Канец чырвонага чалавека) папярэджвае: чалавек можа быць сам сабе і ворагам, і выратавальнікам; і катам, і ахвярай. Нішто насамрэч не абуджае думкі мацней за само жыццё. Можа быць, таму Святлана Алексіевіч абуджае іх, жыццё адлюстроўваючы. Але каб выжыць, прыйдзецца асэнсаваць і нешта выправіць. Учытацца і ўглядзецца ў частку рэчаіснасці, якая ствараецца тут. Сведка яе ўнікальнасці ёсць, і, магчыма, не апошні.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**
tsimoshyk@zviazda.by

**Літаратуразнаўца, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ:**

*— Гэта і сенсацыйна, і прыемна — прысуджэнне «Нобеля» па літаратуры ў гэтым годзе. Я вітаю, што Святлана Алексіевіч атрымала Нобелеўскую прэмію. Але гэта вельмі нечакана, таму што ў яе літаратура своеасаблівая. Гэта вельмі блізка да журналістыкі, калі ёсць дакументальная аснова. Але кожны пісьменнік кіруецца сваёй інтуіцыяй, светапоглядам, талентам. Кожны творыць, піша, як ён хоча, як яму падказвае ўнутранае пачуццё. Ці можа прысуджэнне Нобелеўскай прэміі Алексіевіч абудзіць літаратурны працэс у Беларусі? Скажу так: тых, хто не спіць, будзіць не трэба.*

**Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ:**

*— Гэта навіна прыемная для ўсёй літаратуры, для пісьменнікаў нашай краіны. Таму што ў свеце яшчэ больш увагі будзе да беларускай літаратуры з яе адметнымі тэмамі. Я думаю, што ў Беларусі, як нідзе ў іншых краінах, напісана шмат твораў пра вайну. Падыходы аўтараў былі розныя. У Святланы быў свой погляд, асабліва ў частцы ацэнкі вайны ў Афганістане. Можна з нечым пагаджацца, а з нечым не пагаджацца са Святланай, калі яна выказвае сваё бачанне вайны як чалавек, якому не прыйшлося ваяваць. Бясспрэчна, што вайна — гэта зло. А гэта тэма знакавая для беларускай літаратуры. Ацэньваюць заслугі Святланы Алексіевіч — такім чынам адзначаюцца высока заслугі беларускай літаратуры. Ведама, што за ўсю гісторыю прысваення Нобелеўскай прэміі па літаратуры было 112 пераможцаў. Прыемна, што 14-й па ліку сярод жанчын стала Святлана Алексіевіч. Гэта таксама знак для нашых пісьменніц: пісаць больш на карысць айчыннай літаратуры. Нобелеўскі камітэт адзначыў Святлану Алексіевіч як беларускую пісьменніцу, нягледзячы на тое, што яна піша не па-беларуску, а па-руску, што сведчыць: трэба адзначаць творы найперш па таленце аўтара. Мы павінны віташь і віншаваць Святлану, зычыць ёй далейшых поспехаў, таму што гэта, хутчэй за ўсё, прыцягне дадатковую ўвагу да твораў беларускіх аўтараў.*

**Рэдактар аддзела паэзіі часопіса «Полымя» Юлія АЛЕЙЧАНКА:**

*— Гэта падзея не толькі для Беларусі, але ўвогуле для сусветнай супольнасці. Калі называецца імя лаўрэата Нобелеўскай прэміі па літаратуры — ужо свята. Адметна і тое, што за яго мы павінны дзякаваць жанчыне. Наогул, у сучасным свеце жанчыны займаюць больш актыўную пазіцыю, заяўляюць пра сябе ў розных відах творчасці. На мой погляд, напрамак на прызнанне творчасці жанчын, жаночай літаратуры ў свеце — гэта прагрэсіўны крок сусветнай супольнасці. Трэба адзначыць, што сучасная беларуская літаратура мае не толькі мужчынскі, але і жаночы твар. Можна ўзгадаць часы Еўфрасінні Полацкай, калі трэба было кнігі толькі перапісваць, але з развіццём кніжнай культуры наша зямля нарадзіла іншых цікавых пісьменніц — прынамсі Элізу Ажэшка і Цётку. А цяпер жанчыны больш трывала ўваходзяць у літаратуру, узбагачаючы яе сваім поглядам, адчуваннем і адказнасцю за жыццё, што ёсць у творах Святланы Алексіевіч.*

■ Разважанні пра сучаснасць

# «КАЛІ КІРАВАЦЦА ТОЛЬКІ РАЗЛІКАМ, АБАВЯЗКОВА ПРАЛІЧЫШСЯ»

## Загадчык кафедры філасофіі МДУ імя Куляшова Міхаіл Вішнеўскі пра свае адносіны да філасофіі, недахопы стабільнасці і асаблівасці «кліпавага» мыслення

**З Міхаілам Іванавічам цікава размаўляць на любую тэму, але мы вырашылі не засяроджвацца на нечым адным, а проста паразважаць пра нашу сучаснасць, пра месца звычайнага чалавека ў ёй. Да таго ж было цікава даведацца, чаму наш суразмоўнік, фізік па адукацыі, стаў філосафам. Як там было ў Маркса? Быццё вызначае свядомасць?**



### ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

***Міхаіл Іванавіч Вішнеўскі — доктар філасофскіх навук, прафесар, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь, узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны. Аўтар звыш 240 навуковых і навукова-метадычных публікацый, у тым ліку трох манаграфій, шэрагу навучальных дапаможнікаў для студэнтаў ВНУ, кіраваў падрыхтоўкай і з'яўляецца адным з аўтараў цыкла школьных падручнікаў па грамадазнаўстве. Сфера навуковых інтарэсаў: філасофія адукацыі, сацыяльная філасофія.***

***— Міхаіл Іванавіч, і ўсё ж такі, што агульнага паміж фізікай і філасофіяй? І ці ўсе фізікі становяцца філосафамі?***

— Вядома, не ўсе, але той жа Дэкарт, пра якога я толькі што нагадваў студэнтам на лекцыі, якраз быў з ліку выбітных фізікаў і матэматыкаў. Адно другому не перашкаджае. Сувязь з фізікай, напэўна, у тым, што сама навука даследуе глыбінныя бакі быцця, законы, якія дзейнічаюць шырока і нават паўсюдна.

***— Сённяшняе грамадства, на ваш погляд, жыве больш матэрыяльнымі патрэбамі ці духоўнымі?***

— У грамадстве дзейнічаюць і жывуць людзі. А людзі — гэта істоты і матэрыяльныя, і духоўныя, а разам — сацыяльныя, у іх усё спалучана. А чаго больш, я не стаў бы вызначаць дакладна, бо гэта рэчы цяжка супастаўныя. Мы можам разважаць, што больш прэваліруе ў нашых клопатах — імкненне жыць у дастатку або духоўны дабрабыт. Тут усё па-рознаму бывае. Без людзей практычных, валявых не было б належнага жыццезабеспячэння, а без людзей з высокімі памкненнямі гэтае жыццезабеспячэнне не мела б годнага чалавека сэнсу і накіраванасці.

***— А войны хіба не вынік бездухоўнасці?***

— Гэта вельмі складанае пытанне, у ім шмат чаго пераплялося. У той жа Індыі, напрыклад, праблем не менш — перанаселенасць, беднасць, а канфліктаў няшмат. Глядзіце, як падняўся Кітай. Параўнальна нядаўна па гістарычных мерках гэта было грамадства ў стане заняпаду, а сёння адзін з сусветных лідараў, людзі аптымістычныя, працуюць. Яны знайшлі ў сабе рэсурс змяніць уласнае жыццё. Калі на роўным месцы ўзнікаюць канфлікты накшталт украінскага, гэта ад недахопу гістарычнага вопыту, адсюль неадэкватная рэакцыя на раздражняльнікі. Калі камусьці нешта не падабаецца, гэта яшчэ не прычына, каб кагосьці забіваць, дыскрымінаваць. Звычайна гэта называюць нявыхаванасцю, бескультур'ем. Магчыма, гэтым нехта скарыстаўся. Але не трэба даваць падставу.

***— Як наогул можна пазбегнуць канфліктаў у грамадстве? Ці беларусам тут няма чаго баяцца?***

— У першай палове 1990-х мы яшчэ маглі разадзьмуць агонь нацыяналізму, але павялі сябе годна ў той гістарычнай сітуацыі. Гэта выбар цэлага народа, а не толькі асобных людзей. Вядома, важную ролю выконваюць у такой сітуацыі і лідары, іх адказная пазіцыя. Але ўвогуле беларусы прадэманстравалі разважлівасць. Ад нашага народа ў гісторыі ніколі не ішла агрэсія. На беларускіх землях здаралася ўсялякае, сутыкаліся інтарэсы Польшчы і Расіі, пранікалі сюды ўкраінскія казакі і лілася кроў. Але ініцыятыва была не карэннага насельніцтва. Можна прыгадаць беларускіх феадалаў, якія прымыкалі да той ці іншай уплывовай дзяржавы, але беларусы ў асноўнай масе, хутчэй, былі ахвярамі, чым актыўнымі ўдзельнікамі. Ініцыятыўнасць і актыўнасць — гэта добра, але, калі яны прымаюць формы безагляднай жорсткасці і прамалінейнасці, становяцца небяспечнымі.

***— Няўжо лепш заставацца ахвярай?***

— За спакой таксама прыходзіцца плаціць, але не крывёю, а запаволенасцю развіцця. Але не так проста ўсё спрагназаваць. Гэта ж не забег на нейкую там дыстанцыю, дзе відаць, хто першы, хто апошні. У жыцці вельмі розныя лініі злучаюцца на нашым жыццёвым шляху. Вось вы можаце дакладна сказаць, ці з'яўляецца мерай поспеху матэрыяльны дастатак? Ёсць прыклады, якія сведчаць пра адваротнае. Той жа выпадак з Беразоўскім. Багаты чалавек, але гэта яго не выратавала. Натуральна, нейкі оптымум выгод патрэбны. Але казаць, што гэта павінна стаць самамэтай, нельга. Жыццё, на жаль, абмежавана. З сабой мы нічога не забяром. Ёсць людзі, для якіх статус адыгрывае вызначальную ролю. Але гэта таксама дробна. Розныя існуюць вымярэнні чалавечай годнасці і шчасця. Звярніце ўвагу, што ў вельмі паспяховых еўрапейскіх краінах шмат самагубстваў. Менавіта ў адной з іх адбылася гэтая жахлівая гісторыя з Брэйвікам. Такія рэчы невыпадковыя, яны сведчаць, што і ў сытым, шчаслівым грамадстве ёсць праблемы. Тут цяжка расстаўляць адзнакі па пяцібальнай шкале.

***— І ўсё ж такі, якія праблемы найбольш актуальны для беларусаў?***

— Казаць пра краіну ўвогуле складана. Я не палітык. Але, на мой погляд, тая стабільнасць, у якой мы знаходзімся, таксама ўтрымлівае ў сабе праблему. Пакуль мы не пазбавімся ад грузу неэфектыўных вытворчасцяў, ад лішніх работнікаў у арганізацыях і на прадпрыемствах, у нас застанецца невысокая ў параўнанні з найбольш паспяховымі краінамі прадукцыйнасць працы, а значыць, недастатковая падатковая база. Каб эканоміка была эфектыўнай, трэба працаваць, а не рабіць выгляд. І павінна выраблявацца прадукцыя, якая запатрабавана. Каб ажыццявіць такую санацыю, шмат каго давядзецца пазбавіць працы. Гэта адразу ж створыць сацыяльную напружанасць. Але калі мы не зробім гэтага, то многім рызыкуем. Нулі на грашовых знаках сведчаць, што эканоміка не ва ўсім эфектыўная. Траціцца больш сродкаў, чым зарабляе краіна. А ў такіх абставінах цяжка спадзявацца на інвестыцыі з боку вытворцаў. Уся нагрузка кладзецца на дзяржаву, і гэта тармозіць развіццё. Трэба ствараць новыя працоўныя месцы, займацца перападрыхтоўкай спецыялістаў. Але людзі таксама павінны быць мабільнымі, гатовымі да перамен. Неабходна паставіць чалавека перад фактам: працы няма, праяві пэўную ініцыятыву ў пошуку занятку.

***— Для гэтага спатрэбіцца цалкам змяніць мысленне чалавека. Можа, неабходна нейкія спецыяльныя прадметы ў школе ўвесці?***

— Так і павінна быць. Трэба пачынаць з сістэмы адукацыі. У новага пакалення трэба фарміраваць разуменне, што мы існуем у няпростым свеце. Краіна невялікая, яна не можа ўтрымліваць дармаедаў. Зразумела, трэба клапаціцца пра інвалідаў, дзяцей, старых. Гэта катэгорыі, якія маюць патрэбу ў сацыяльнай абароне. А калі гэта чалавек працаздольны, чаму яго павінны карміць астатнія? Па сутнасці многія працоўныя месцы сёння — своеасаблівы працяг сацыяльнай дапамогі. Такога быць не павінна. Трэба прывучаць да думкі, што плацяць за працу, калі яе няма, трэба шукаць. А калі не хочаш, могуць і пакараць.

***— Тым больш што і закон адпаведны ёсць...***

— А што рабіць, калі людзі не жадаюць браць на сябе адказнасць за ўласны лёс? Зямля пустуе, трэба яе апрацоўваць, а ахвотных няма. Закон дапамагае знаходзіць вырашэнні такіх пытанняў. Але справа не толькі ў дармаедах. Трэба мадэрнізаваць сістэму працоўных месцаў, ліквідаваць лішнія. Гэта б дазволіла павысіць аплату працы і вызваліць людзей для новай дзейнасці. Для грамадства вельмі важна, каб быў рэзерв працоўнай сілы. Калі пачынаецца новая справа, людзі б маглі працаўладкоўвацца. А зацікавіць можна годным заробкам або іншымі выгодамі. Вельмі багатыя краіны здольны прывабіць працоўныя сілы з іншых рэгіёнаў, але ў нас заробкі не самыя высокія. Трэба на свае рэсурсы арыентавацца. Таму неабходна працоўная мабільнасць.

***— Акрамя таго, што вы шмат друкуецеся, у тым ліку ў замежных выданнях, складаеце дапаможнікі для студэнтаў, вы яшчэ з'яўляецеся адным з аўтараў школьных падручнікаў па грамадазнаўстве. Якія, на ваш погляд, недахопы ёсць у школьных падручніках наогул?***

— Падручнік разлічаны на дзіцячую аўдыторыю, і тут важна адчуць, што менавіта гэтай катэгорыі патрэбна, як вучань яго ўспрыме. З аднаго боку, неабходна, каб было цікава, з іншага — каб гэта магчыма было прыкласці да жыцця. Бяда школьных падручнікаў у перагружанасці матэрыялам. Вельмі шмат даецца паняццяў, і школьнікі не паспяваюць іх звязаць паміж сабой. Часта педагогі імкнуцца даць як мага больш. Але задача не ў гэтым. Трэба, каб у свядомасці навучэнцаў завязаліся нейкія вузельчыкі. Таму карысна пахадзіць вакол, абмеркаваць іншыя пункты гледжання, супаставіць з жыццёвымі абставінамі. Каб потым гэта працавала, каб чалавек меў нейкую мадэль разваг і дзеянняў. Я радыкальна зменшыў бы колькасць навукова-тэарэтычнага матэрыялу і павялічыў практычную частку, каб была прывязка да жыццёвых рэалій.

***— Магчыма, тэмп нашага жыцця не дазваляе прыпыніцца, падумаць, зразумець. Вось XIX стагоддзе, пачатак XX, там час цёк не так хутка...***

— Калі пачытаць літаратуру тых гадоў, усе заўсёды скардзіліся на недахоп часу. Адна з нашых праблем — гэта паспешлівасць і няўменне разумець іншага. Дарэчы, гэта на міжнародным жыцці таксама адбіваецца. Паспешнасць рэакцыі і нежаданне зразумець іншую пазіцыю. Вельмі хутка хапаюцца за зброю, вельмі хутка прамаўляюць рэзкія словы, абразы. А гэта ж потым не забываецца. Ні пралітая кроў, ні абраза нацыянальных пачуццяў. Трэба быць стрыманымі і паважаць адзін аднаго.

***— Вы працуеце з моладдзю. Якія цікавыя думкі яны выказваюць? Няма ўражання, што яны больш практычныя?***

— Яны мне цікавы, як прадстаўнікі іншага пакалення. Цікава бачыць, што змянілася. А што датычыцца практычнасці, людзі заўсёды былі практычнымі. І ў гады майго юнацтва таксама. Думалі пра заробкі, пра кар'еру. Проста зараз варыянтаў больш. А асноўныя ўзроставыя асаблівасці захаваліся. Маладосць — гэта час выбару, празмерная практычнасць звужае яго поле. Калі не рызыкаваць, не кіравацца інтуіцыяй, а толькі разлікам, абавязкова пралічышся. Нават у разліках трэба адводзіць месца выпадку і не забывацца пра сумленне.

***— Зараз шмат кажуць пра кліпавае мысленне, няўменне звязаць свае думкі.***

— Калі маладыя людзі вельмі нудна і доўга кажуць, гэта таксама насцярожвае. Мяне не вельмі пужае фрагментарнасць іх мыслення. Засмучае іншае — абмежаваны слоўнікавы запас, няўменне вызначаць паняцці. Думкі могуць быць і кароткія, але ўнутрана добра структураваныя. Гэтаму трэба вучыць.

***— Гэта ад недахопу чытання?***

— Адбываюцца фундаментальныя змяненні ў культуры. Кніга як друкаваны тэкст адыходзіць на другі план. На першы выходзіць відэаінфармацыя, з ёй трэба ўмець працаваць. Я мяркую, што нават у чалавека з кліпавым мысленнем узнікае жаданне нешта засвоіць цалкам. Але гэта, як правіла, іншыя тэксты. Яны чытаюць часам тоўстыя кнігі, пра таго ж Гары Потэра. А некаторыя аўтарытэтныя кнігі не могуць адолець. Нічога страшнага ў гэтым няма. Хай літаратура прыстасоўваецца. Галоўнае, каб унутры фрагментаў гэтай думкі не было бесталковасці, каб людзі ўмелі тлумачыць сутнасць. А да класікі трэба дарасці. Тым больш што сённяшнія школьнікі чытаюць тую класіку, якую мы ў свой час і ў руках не трымалі. Да таго ж, мы здабываем вопыт з розных крыніц. Узорныя тэксты зусім неабавязковыя.

***— Філосафы часта прамаўляюць мудрыя думкі, якія абагульняюць іх веды. У вас ёсць любімыя афарызмы?***

— Асобна ўзятая думка — гэта фрагмент чагосьці. Будынак складзены з цаглін, і сказаць, што адна з іх узорная, было б не разумна. Усе выказванні ў нешта ўбудаваны. Я выкарыстоўваю афарызмы, але ў якасці жарту, каб студэнты пераключыліся і паглядзелі на прадмет з іншага боку.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

# САБРАЦЬ МАЗАІКУ НАНОЎ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Сто квадратных метраў смальты (гэта амаль палова твора) давялося выкладваць наноў. Аляксандр Кішчанка, калі выраблаў пано, вельмі ўважліва ставіўся да матэрыялу. Ездзіў па смальту ва ўкраінскі Лісічанск, сачыў, як яе вараць. Падабраць такую ж аказалася складана. Спецыялісты прывезлі спачатку шкляныя пласцінкі з Піцера, але яны не падышлі. Ужо пазней знайшлі кіеўскую смальту, вельмі падобную да той, з якой працаваў славуты манументаліст.

Для родзічаў Кішчанкі аднаўленне мазаікі стала сямейнай справай.

— Сын Аляксандра Міхайлавіча, таксама Аляксандр, неяк падышоў да мяне і кажа: «Ніна, можна я вазьмуся за рэстаўрацыю?» — дзеліцца ўспамінамі **ўдава Кішчанкі Ніна КУХАРЭНКА**. — Вядома, я яго падтрымала: Аляксандр добры манументаліст. «Гэта твой абавязак перад бацькам», — адказала яму. Да рэстаўрацыі падключыўся яшчэ і ўнук мужа.

Ніна Уладзіміраўна распавядае, што пано «Партызаны» стала адной з першых кампазіцый у Мінску, выкананай у тэхніцы мазаікі. «Гэта была вельмі дарагая работа. У ёй Аляксандр Міхайлавіч хацеў перадаць сілу духу, мужнасць беларускага народа. Пано адлюстроўвае яшчэ і сувязь пакаленняў — мінулага, сучаснасці і будучыні».

Па словах **загадчыцы сектара культуры ўпраўлення ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі адміністрацыі Заводскага раёна сталіцы Ірыны ШУГАЛЫ,** аднаўленне мазаікі абышлося ў 19 мільярдаў рублёў. Гарантыйны тэрмін, згодна з дагаворам будаўнічага падраду, складае пяць гадоў. Але спецыялісты «Белрэстаўрацыі» запэўніваюць, што пано пратрымаецца і 30 гадоў.

Цяпер мазаікай на Партызанскім праспекце могуць любавацца ўсе жыхары сталіцы.

— Ведаеце, манументальнае мастацтва лічыцца самым уразлівым, — кажа Ніна Уладзіміраўна. — Вулічны асяродак, дзе такія творы змяшчаюцца, не спрыяе доўгажыхарству. Адбіваюцца прыродныя ўмовы, чалавечы фактар. Пано «Партызаны» пачало разбурацца яшчэ пры жыцці аўтара. Памятаю, ён вельмі перажываў і нават не спадзяваўся, што кампазіцыю адновяць... Хацела б падзякаваць усім, хто дапамог зрабіць рэстаўрацыю. Гэта наша культурная спадчына, нацыянальны здабытак, які трэба захоўваць.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

# «Са сталічным тэлебачаннем у нас супалі інтарэсы»

TV@R



**Вядомы беларускі тэлевядучы Ягор ХРУСТАЛЁЎ у мінулым сезоне вёў ток-шоу «Вечар цяжкага дня» на тэлеканале «Беларусь 1». Праграма мела свайго гледача. Многія прыхільнікі хацелі бачыць яго ў гэтай праграме і надалей, але раптам даведаліся, што з восені ён вядзе ажно два праекты на тэлеканалах СТБ і «РТР-Беларусь». Менавіта з гэтай тэмы мы і пачалі з ім нашу гутарку.**

## «РАБІЦЬ ІНТЭРВ'Ю — АДЗІН З САМЫХ ЦІКАВЫХ ЗАНЯТКАЎ»

***— Ягор, вы неяк нечакана для некаторых тэлегурманаў памянялі месца працы.***

— Гэта тлумачыцца проста. Тэлевізійны свет даволі мабільны. Я пяць гадоў працаваў на расійскім канале СТС, пасля вярнуўся і да 31 снежня 2014 года ў мяне быў кантракт на вытворчасць «Вечара цяжкага дня». З тых часоў праграму не аднаўлялі. Напэўна, у «Белтэлерадыёкампаніі» на гэта былі свае прычыны. Пасля з'явілася прапанова рабіць «Вечар...» для «Беларусь 3». Але, калі з'явілася магчымасць рыхтаваць буйное ток-шоу для тэлеканала «РТР-Беларусь», я пагадзіўся. Да таго ж у нас супалі інтарэсы. Я вельмі хацеў весці перадачу ў фармаце ток-шоу, а Юрыю Казіятку, генеральнаму дырэктару СТБ, патрэбны быў вопытны вядучы.

***— Калі ў апошні раз гледачы пабачылі «Вечар цяжкага дня»?***

— Летась у снежні.

***— І чым вы займаліся ўвесь гэты час, пакуль не атрымалі новую працу на тэлебачанні?***

— Кіраваў прадзюсарскім цэнтрам «Спамаш». З ім у мяне дзейнічаў кантракт на адзін год. Праца тычылася канцэртна-артыстычнай дзейнасці.

***— Аднак, я ўпэўнены, на тэлебачанні вам значна прасцей. Хаця арганізатарскі досвед вы назапасілі яшчэ ў Маскве.***

— На СТС мая праца была звязана не столькі з арганізацыяй, колькі з тэлевізійным бізнесам у чыстым выглядзе. Я займаўся прасоўваннем прадуктаў канала за межы Расійскай Федэрацыі. Працы цікавай хапала, аднак не такой, як зараз. Мяркую, што вам таксама падабаецца запісваць інтэрв'ю, кантактаваць з людзьмі. Для мяне гэта наогул адзін з самых цікавых заняткаў у жыцці.

***— Прыгадайце самы яскравы момант падчас працы ў прадзюсарскім цэнтры, які можна было б адзначыць у партфоліа.***

— Гэта, напэўна, кампазіцыя «Зроблены ў Беларусі», якую я спецыяльна запісаў для артыстаў «Спамаша». Яна даволі заўважна гучала на працягу гэтага года.

## «ТЭМЫ НОВАГА ТОК-ШОУ ЗВЯЗАНЫ З БЯГУЧЫМІ ПАДЗЕЯМІ»

***— Што з сябе ўяўляе ваш новы праект «Што адбываецца»?***

**15.50** «Абсалютны слых».
**16.30** «Геній рускага мадэрну. Фёдар Шэхцель». Дак. фільм.
**17.15** Шэдэўры рускай музыкі. А. Скрабін. «Паэма экстазу», «Праметэй».
**18.05** «Ралан Пеці. Паміж мінулым і будучыняй». Дак. фільм.
**18.45** «Рэгтайм, або Разарваны час». Адна абсалютна шчаслівая вёска. Марыя Прымачэнка».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**21.15** «Пакаленне рэвалюцыя».
**23.00** «Рэгтайм, або Разарваны час». «Прыбыццё цягніка. Андрэй Сахараў».
**23.45** Мастсавет.
**1.15** «Услых». Паэзія сёння.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. Госць: Веранiка Доліна. 2007 год.
**7.00, 8.35, 9.40, 11.00, 12.55, 14.30, 15.40, 17.00, 18.50, 20.25, 21.40, 23.00, 0.50, 2.30, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.15** Маст. фільм «Капеж».
**8.45** М/ф «Зайчык заблудзіўся».
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. Госць Коля Васін. 2008 год.
**13.15** Маст. фільм «Над намі Паўднёвы крыж».



**14.45** М/ф «Залатое кураня».
**18.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. Госць: Алена Рэштняк. 2007 год.
**19.10** Маст. фільм «Ніна».
**20.45** М/ф «Як вожык і медзведзяня мянялі неба».
**0.00** «СевАлогія» з Севам Наўгарадцавым: «Легенда рок-н-рола». 2005 год.
**1.15** Маст. фільм «Месяц май».
**2.45** М/ф «Заяц і Вожык».

### EUROSPORT

**4.00, 8.00, 12.30, 20.00, 1.45** Веласпорт. Чэмпіянат Еўропы па трэкавых велагонках.
**6.00, 9.30, 15.30, 23.30, 2.30** Тэніс. Турнір WTA.
**11.30, 14.15** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Жаночыя. «Вольфсбург» — «Спартак» (Субоціца).
**0.15** Футбол. Веліч футбола.
**0.20** Футбол. MLS. Найлепшыя моманты.
**0.45** Футбол. Лаціна.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 9.55, 18.05, 22.00, 3.10** Серыял «Быльця».
**6.45** Камедыя «Цяжарны».
**8.20** Камедыя «Вялікае вяселле».
**10.40** Камедыя «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець».
**12.30** Камедыя «Кекс у вялікім горадзе».
**14.00, 14.45, 15.25** «Камедыянты (Шоу)».
**14.25, 15.10, 22.50, 0.50, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Усмешка Бога, або Чыста адэская гісторыя».
**18.45** Камедыя «Домік у сэрцы».
**20.20** Камедыя «Заказаны да непрытомнасці».
**23.10** Камедыя «Круты татачка».
**1.15** Камедыя «Каханне з акцэнтам».
**4.00** Камедыя «Ёлкі 2».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.50** «Доктар І...».
**8.15, 18.50, 1.30** Серыял «Курт Сеіт і Аляксандра».
**10.05, 4.00** Дак. серыял «Судовыя страсці».
**10.55, 4.45** Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
**11.50** Дак. серыял «Справа Астахава».
**12.45** Дак. серыял «Сакрэты экстрасэнсаў».
**13.40, 17.55** Серыял «Тайны следства».
**14.30, 5.35** «Простыя складанасці».
**15.00, 3.15** «Нераскрытыя тайны».
**16.00** «Шчырая гутарка».
**16.55, 21.55** Серыял «Справа гастранома № 1».
**20.55, 0.45** Серыял «Паўночны вецер».
**22.55** «Зорныя гісторыі».
**23.50** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».
**0.35** «Рокіно».

### ТБ1000

**6.40, 15.40** Фэнтэзі «Гары Потэр і Кубак Агню».
**9.25, 4.05** Трылер «Анёлы і Дэманы».
**11.55** Драма «На самым дне акіяна».
**13.50** Камедыя «Радасная падзея».
**18.20** Жахі «Жанчына ў чорным».
**20.00** Драма «Лепшая прапанова».
**22.10** Драма «Выжывуць толькі палюбоўнікі».
**0.10** Трагікамедыя «Два дні ў Парыжы».
**1.50** Драма «Сем гадоў у Тыбеце».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Драма «Балада пра бомбера».
**9.30** Дэтэктыў «Дзесяць негрыцянят».
**11.50** Камедыя «Вясёлая моладзь».
**13.30** Камедыя «Сябры сяброў».
**15.10** Баявік «Асабісты нумар».
**17.00** Баявік «Сіндром шахматыста».
**20.20** Камедыя «Адзінокі па кантракце».
**22.10** Камедыя «Змяшаныя пачуцці».
**23.50** Камедыя «Кітайская бабуля».
**1.30** Драма «Вязень замка Іф».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**6.50, 8.10** Гульні розуму.
**7.15, 13.10** Навуковыя недарэчнасці.
**7.40, 12.40** Зрабі або памры.
**9.20, 13.30, 19.30** Шаша праз пекла.
**10.10, 14.20, 20.10** Ледзяная дарога.
**11.00** Мегазаводы.
**11.50** Золата горада-прывіда.
**15.10** Самыя небяспечныя жывёлы.
**16.50** Золата ў халодных вадзе.
**17.40, 22.40, 2.50** Рыбы-пачвары.
**18.30** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**21.00, 1.10, 4.30** Золата Юкана.
**21.50, 2.00, 5.15** Дзікі тунец.
**23.30, 3.40** Расследаванні авіякатастроф.
**0.20** Паранармальнае.

### DISCOVERY

**8.00, 12.30** Мяцежны гараж.
**8.50** Навука магіі.
**9.45, 14.20, 21.30** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.45, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.40, 17.05** Багажныя войны.
**11.35, 1.00, 7.13** Голыя і напалоханыя.
**13.25, 6.25** Эфект Карбанара.
**15.15, 5.38** Поўны фарсаж.
**16.10, 3.00** Махінатары.
**18.00** Гаражнае золата.
**19.00** Паляўнічыя на рэліквіі.
**20.00** Склады.
**22.00** Буйны ўлоў.
**23.00** Смяротны ўлоў.
**0.00** Дарожныя каўбоі.
**2.00, 4.50** Стальныя хлопцы.
**4.00** Маланкавыя катастрофы.
**4.25** Сапраўдныя аферысты.

# ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА*

## РЭДКІ ФІНАЛЬНЫ МАТЫЎ

Такое заканчэнне можна атрымаць у пазіцыі:



**Белыя:** a3, a5, e1, g1, h2, h6 (6).
**Чорныя:** c3, c5, d2, d4, d6, f8, g7, h4 (8).

B6!, g3!, e7, b4!, c3 (b6) ab4. Чорныя прайгралі, пераканайцеся ў гэтым самастойна.

## АГЛЯД СПАБОРНІЦТВАЎ

У Краневе (Балгарыя) адбыўся юнацкі чэмпіянат свету па шашках- 64, у якім удзельнічалі 172 гульцы з 13 краін. На рахунку прадстаўнікоў нашай краіны 21 медаль, 11 з якіх залатыя!

Прайшоў чэмпіянат свету па маланкавай гульні. Пераможцамі сталі Вера Хвашчынская і Дар'я Нікіфарава. Дар'я Федаровіч фінішавала другой, трэцяе месца падзялілі Анастасія Барышава, Дзмітрый Немец і Яна Лазовік.

Ладзіўся чэмпіянат свету па хуткай гульні. Залатыя медалі заваявалі Дар'я Федаровіч, Вера Хвашчынская, Міхаіл Семянюк і Аляксандра Спірына, бронзавыя ўзнагароды — Анастасія Барышава, Дар'я Нікіфарава і Вікторыя Нікалаева.

Выдатна выступілі беларускія спартсмены ў класічнай праграме. Яны прынеслі краіне 5 залатых медалёў з 12 магчымых! Чэмпіёнамі свету прызнаны Дар'я Федаровіч, Вера Хвашчынская, Міхаіл Семянюк, Аляксандра Спірына і Вікторыя Нікалаева, бронзавымі прызёрамі — Анастасія Барышава, Дзмітрый Немец і Дар'я Нікіфарава.

Па выніках чэмпіянату ў класічнай праграме быў падведзены камандны залік. Зборная Беларусі на першым месцы сярод дзяўчат, на трэцім — сярод юнакоў, а ў агульнакамандным заліку яна выйшла на высокае другое месца.

**РАШЭННІ**

**«Імклівая атака»** (А. Валюк-М. Гаруноў): 5. cb2! ef6 6. bc3 і чорныя здаліся.

## «МЫ РАЗАМ» — ДЛЯ ЛЮБІМАЙ КРАІНЫ!

**Учора ў Рэспубліканскім Палацы культуры прафсаюзаў адбыўся гала-канцэрт Рэспубліканскай народна-патрыятычнай акцыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (ФПБ) «Мы разам!». Ён стаў яркім фінальным акордам маштабнага мерапрыемства, якое з чэрвеня па кастрычнік сёлета сабрала звыш 70 000 гледачоў у больш чым 50 гарадах Беларусі.**

Галоўная ідэя акцыі — аб'яднаць усіх тых, хто ганарыцца сваёй краінай і штодня працуе на карысць Беларусі. Мерапрыемствы акцыі праводзіліся ў рамках розных свят (Дзень горада, Дажынкі, Дзень міру, Дзень настаўніка і іншых) і суправаджаліся віншаваннем працоўных дынастый, маладых спецыялістаў, сустрэчамі моладзі раёна з вядомымі прафсаюзнымі спартсменамі. А галоўным дзействам станавіўся канцэрт фіналістаў Рэспубліканскага вакальнага конкурсу ФПБ пад дэвізам «Новыя галасы — для любімай краіны!» і выканаўцаў беларускай эстрады.

# ПЯТНІЦА, 16 КАСТРЫЧНІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х.
**9.10 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «20 гадоў без кахання».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-5».**
**13.10** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Думай як жанчына».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.25 Серыял «Чорныя кошкі».**
**17.40** Зроблена ў Беларусі.
**18.00** «Terra incognita». Беларусь невядомая.
**21.00** Панарама.
**21.45** Зроблена ў Беларусі.
**22.05 Меладрама «Мой белы і пушысты».**
**0.15** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05, 16.00** «Арол і рэшка. На краі свету». Трэвел-шоу.
**10.10** Дак. цыкл «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**11.10** Вось гэта дзіва!
**11.40** Капейка ў капейку.
**12.15, 17.55 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**13.15 Серыял «Косці».**
**14.05 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**17.00, 23.25** «Пін-код».
**19.15 Выбар гледачоў. Баявік «Людзі ў чорным».**
**21.10** «Бітва экстрасэнсаў. Трэцяя сусветная».
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**0.15** Рэпарцёр.
**1.00 Серыял «Усемагутныя Джонсаны».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.15** «Дабраранак».
**7.45, 11.20, 16.45, 0.00** «Калейдаскоп».
**8.00 «Лутра». Маст. фільм.**
**9.05 «Ніхто, акрамя нас». Драма.**
**10.55** «Сіла веры».
**11.35 «Чартоўкі». Трылер.**
**13.25** «Беларускаму дзяржаўнаму ансамблю «Песняры» — 45». Юбілейны канцэрт.
**14.35** «Гэты дзіўны свет...» Чэслаў Немен.
**15.05** А. Залётнеў. «Міхал Клеафас Агінскі. Невядомы партрэт». Опера, прысвечаная 250-годдзю з дня нараджэння М.К. Агінскага.
**17.00 «Камедыянт». Драма.**
**18.40 «Балада пра Берынга і яго сяброў». Маст. фільм.**
**20.15, 23.35** «Камертон». Народны артыст Расіі Уладзімір Юматаў.
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Марк Шагал. Майстэрства кахання». Дак. фільм.
**21.55 «Развод па-італьянску». Трагікамедыя.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.15** Хакей. Белнафтахім — Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Шахцёр» (Салігорск).
**9.10** Бокс. Чэмпіянат свету. Фіналы.
**11.10** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. «Дынама» (Мінск) — «Рапід» (Аўстрыя).
**13.05** Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. 1/4 фіналу. Польшча — Беларусь.
**15.30** Футбол. ЧЕ-2016. Кваліфікацыя. Славакія — Беларусь.
**17.20** Сучаснае пяцібор'е. Кубак свету.
**17.50** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**18.20** Піт-стоп.
**18.50, 23.30** PRO спорт. Навіны.
**18.55** Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі. «ФК Віцебск» — БАТЭ (Барысаў).
**20.55** Фактар сілы.
**21.25** Змяшаныя адзінаборствы. ММА. М-1 Challenge.
**23.40** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.05** «Вучыцца жыць».
**14.35** «Час пакажа».
**16.20 Камедыя «Дача».**
**18.20** «Чакай мяне. Беларусь».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05 Маст. фільм «Што хавае хлусня».**
**22.40** «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі».
**23.50** «Легенды Live». «Маме падабаецца».
**0.30** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Маст. фільм «Любоў да сабак абавязковая».**



**10.15** «Далёкія сваякі».
**10.40** «Дакументальны праект»: «Якія бягуць у нябёсы».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!»
**13.50** «Ежа багоў».
**14.45, 23.00 Серыял «Энігма».**
**16.50** «Добры дзень, доктар!»
**17.35** «Званая вячэра».
**18.35** «Такі лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** 1/4 фіналу Міжнароднай лігі КВЗ.
**22.10** «Глядзець усім!»
**0.25** «Вялікая гульня». Покердуэль.
**1.10 Маст. фільм «Рэстлер».**

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Любімыя акцёры».
**9.30 Маст. фільм «Прыгожа жыць не забароніш».**
**10.45** «Зроблена ў СССР».
**11.15 Маст. фільм «Прадаецца кошка».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20 Серыял «Развод».**
**15.05, 5.00** «Справы сямейныя».
**16.20** «Сакрэтныя матэрыялы».
**17.20, 3.30 Серыял «Маўклівы сведка».**
**19.25 Серыял «У ракі два берагі».**
**23.15 Серыял «Набожная Марта».**
**1.55 Маст. фільм «Махляры».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.05** «Маршал Язаў. Па сваіх не страляю».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Тайны следства».**
**19.10, 20.55 Серыял «Скліфасоўскі».**
**22.00, 23.10 Серыял «Нараджаная зоркай».**
**23.55 Маст. фільм «Час збіраць».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05** «Следства вялі...»
**7.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**8.05** «Лаліта».
**9.05** «Раніца з Юліяй Высоцкай».
**10.20 Серыял «Ляснік».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.20** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.40** «Справа густу».
**15.05, 16.20 Серыял «Ліцеіны, 4».**
**17.55** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.40 Серыял «Дэльта. Працяг».**
**21.35 Маст. фільм «Маё прозвішча Шылаў».**



**23.15** Ток-шоу «Большасць».
**0.25** «Героі «Мянтоўскіх войнаў».

### 8 КАНАЛ

**7.00, 14.05, 19.40, 21.05, 23.50** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 19.45 Серыял «Злачынная імперыя».**
**8.30, 18.30 Серыял «Мушкецёры».**
**9.30, 10.35, 13.50, 15.45, 19.30, 21.00** «Хатняя крама».
**9.45** Дак. серыял «Тайны прыроды».
**10.50 Мюзікл «Стылягі».**
**13.05 Серыял «Флэш».**
**14.10 Серыял «Лавіна».**
**16.15** «Адшукваецца адпачынак».
**16.45 Серыял «Радзіма».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Трылер «Пасля заходу».**
**22.50** «Хобі+TV». «Свой фермер».

### ВТБ

**6.00, 14.30, 4.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**6.30, 17.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** «Турбакіксер».
**8.30, 13,00** «Ералаш».
**9.00** Серыял «Анжаліка».
**10.00, 19.00** Серыял «Месяц».
**11.00** Камедыя «Мільён для чайнікаў».
**13.30, 20.00** Серыял «Кухня 4».
**15.00, 3.00** «Спатканне для мамы».
**16.00** Серыял «Навіны».
**17.00, 4.30** «Лаві момант».
**18.00, 23.30** «Уральскія пельмені».
**21.10** Камедыя «Адпетыя махляры».
**23.15, 1.00, 5.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.30** Скетчком «Студэнты».
**1.30, 5.30** «Дурні і дарогі».
**2.00** «Ленінградскі Stand-up клуб».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.20** Шэдэўры старога кіно. «На мяжы». Маст. фільм.
**12.10, 23.10, 2.40** «Сусветныя скарбы культуры».
**12.30** «Правілы жыцця».
**13.00** «Пісьмы з правінцыі». Уладзімір.
**13.30** «Добрая раніца». Маст. фільм.
**15.10** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**15.50** «Царская ложа».
**16.30** «Доктар Трапезнікаў. Выжыць, а не памерці...» Дак. фільм.
**17.10** «Аркестр дэ Пары». Канцэрт у зале «Плэель».
**18.20** «80 гадоў Барысу Забораву. «У пошуках страчанага часу». Дак. фільм.
**19.00** «Рэгтайм, або Разарваны час». «Прыбыццё цягніка. Андрэй Сахараў».
**19.45** «Цэнтр кіравання «Крым». Дак. фільм.
**20.30** «9 дзён аднаго года». Маст. фільм.
**22.20** «Лінія жыцця». Алег Анофрыеў.
**23.45** Мастсавет.
**23.50** Партрэт пакалення. «Парніковы эфект». Маст. фільм.
**1.30** «Мена». «Леў і 9 гіен». М/ф для дарослых.
**1.55** «Шукальнікі». «Скарб Ванькі-Каіна».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. Госць Коля Васін. 2008 год.
**6.55, 8.30, 9.40, 11.00, 12.50, 14.25, 15.40, 17.00, 19.00, 20.35, 21.40, 23.00, 1.00, 2.35, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.15** Маст. фільм «Над намі Паўднёвы крыж».
**8.45** М/ф «Залатое кураня».
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. Госць: Алена Рэшатняк. 2007 год.
**13.10** Маст. фільм «Ніна».
**14.45** М/ф «Як вожык і медзведзяня мянялі неба».
**18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1982. 1-я частка. Паўтор ад 2011 года.
**19.15** Маст. фільм «Вяртанне з арбіты».
**20.50** М/ф «Калі падаюць зоркі».
**22.00** «Колба часу».
**0.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. Госць: Вераніка Доліна. 2007 год.
**1.15** Маст. фільм «Капеж».
**2.45** М/ф «Зайчык заблудзіўся».

### EUROSPORT

**4.00, 8.00, 10.30, 20.00, 1.30** Веласпорт. Чэмпіянат Еўропы па трэкавых велагонках.
**6.00, 9.30, 17.00, 1.00, 2.30** Тэніс. Турнір WTA.
**23.30** Футбол. MLS. Найлепшыя моманты.
**0.00** Футбол. Веліч футбола.
**0.30** «Час скачак».
**0.45** Акадэмія GT. Аўтаспорт.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 9.30, 17.35, 22.00, 3.10** Серыял «Былыя».
**6.25** Камедыя «Вялікае вяселле».
**8.00** Камедыя «Кекс у вялікім горадзе».
**10.20** Камедыя «Усмешка Бога, або Чыста адэская гісторыя».
**12.25** Камедыя «Домік у сэрцы».
**14.00, 14.45, 15.25** «Камедыянты (Шоу)».
**14.25, 15.10, 19.55, 22.50, 0.50, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Круты татачка».
**18.20** Камедыя «Закаханы да непрытомнасці».
**20.20** Камедыя «Чалавек-эльф».
**23.10** Камедыя «Сведка на вяселлі».
**1.15** Камедыя «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець».
**4.00** Камедыя «Каханне з акцэнтам».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.55** «Доктар І...».
**8.25, 18.55, 2.35** Серыял «Курт Сеіт і Аляксандра».
**10.10, 5.15** Дак. серыял «Судовыя страсці».
**11.00** Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
**11.55** Дак. серыял «Справа Астахава».
**12.50** Дак. серыял «Сакрэты экстрасэнсаў».
**13.45, 18.00** Серыял «Тайны следства».
**14.40** «Простыя складанасці».
**15.10, 4.30** «Нераскрытыя тайны».
**16.10** Мой герой.
**17.00** Серыял «Справа гастранома № 1».
**21.10** Камедыя «Пісьмы да Джульеты».
**23.05** «Зорныя гісторыі».
**23.50** «Доказ віны».
**0.15** Маст. фільм «Крымінальнае чтыво».

### ТВ1000

**6.20, 16.00** Фэнтэзі «Гары Потэр і ордэн Фенікса».
**8.35** Драма «Палёт даўжынёю ў жыццё».
**10.10** Камедыя «Настрой індыга».
**12.15** Драма «Сем гадоў у Тыбеце».
**14.30, 5.00** Баявік «Падарожжа да Цэнтра Зямлі».
**18.15** Трылер «Ілюзія падману».
**20.10** Драма «Джобс: Імперыя спакусы».
**22.15** Камедыя «Хацеў бы я быць тут».
**0.00** Камедыя «Два дні ў Нью-Ёрку».



**1.35** Драма «Адкрытае акно».
**3.10** Меладрама «Да цуду».

### ТВ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Драма «Андэрсан. Жыццё без кахання».
**8.45** Драма «Ваенна-палявы раман».
**10.20** Драма «Вышыня 89».
**12.10** Драма «Смяцяр».
**13.50** Драма «Ганна і камандор».
**15.20** Трагікамедыя «Пра жонку, мару і яшчэ адну...».
**16.40** Драма «Пахавайце мяне за плінтусам».
**18.40** Драма «Нябесны суд».
**20.20** Драма «Нябесны суд. Працяг».
**23.50** Драма «Каляфутбола».
**1.30** Драма «Брэсцкая крэпасць».
**3.55** Драма «Царскае паляванне».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**6.50, 8.10** Гульні розуму.
**7.15, 13.10** Навуковыя недарэчнасці.
**7.40, 12.40** Зрабі або памры.
**9.20, 13.30, 19.20** Золата Юкана.
**10.10, 14.20, 20.10** Дзікі тунец.
**11.00** Мегазаводы.
**11.50** Золата горада-прывіда.
**15.10** Жанчына, выхаваная малпамі.
**16.00** Самыя небяспечныя жывёлы.
**16.50, 21.00, 1.10, 4.30** Капітуляцыя.
**17.40, 22.40, 2.50** Вайна генералаў.
**18.30** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**21.50, 2.00, 5.15** Апошні год Гітлера.
**23.30, 3.40** Расследаванні авіякатастроф.
**0.20** Паранармальнае.

### DISCOVERY

**8.00, 12.30** Поўны фарсаж.
**8.50** Эфект Карбанара.
**9.45, 14.20, 21.30** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.45, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.40, 17.05** Стальныя хлопцы.
**11.35, 7.13** Акварыумны бізнес.
**13.25, 6.25** Усё і нічога.
**15.15, 5.38** У пагоні за класікай.
**16.10, 3.00** Махінатары.
**18.00** Дарожныя каўбоі.
**19.00** Смяротны ўлоў.
**20.00** Буйны ўлоў.
**22.00** Як уладкаваны Сусвет.
**23.00** Космас навыварат.
**0.00** Чалавек і Сусвет.
**1.00** Ільвіная кроў.
**2.00, 4.50** Паляўнічыя на склады.
**4.00** Маланкавыя катастрофы.
**4.25** Сапраўдныя аферысты.

## СУБОТА, 17 КАСТРЫЧНІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.25** Існасць.
**7.50 Меладрама «Мой тата — лётчык».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.40, 23.30 Серыял «Як выйсці замуж за мільянера-2».**
**10.45** «50 рэцэптаў першага».
**11.20** Дача.
**12.10** Ток-шоу «Здароўе».
**12.50** «Terra incognita». Беларусь невядомая.
**13.30** Выйсце ёсць.
**14.05, 0.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-5».**
**15.15** Краіна.
**15.45 Меладрама «Чацвер 12-е».**
**17.25 Меладрама «Маці і мачаха». 1-я і 2-я серыі.**
**21.00** Панарама.
**21.40 Меладрама «Формула шчасця».**
**0.25** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**6.50** М/с «Сябры анёлаў».
**7.25** Навуковае шоу прафесара Адкрывашкіна.
**7.55 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**10.00** Азбука густу.
**10.35** М/с «Прыгоды Дзіна».
**10.50, 21.05** Тэлебарометр.
**10.55** «Бітва экстрасэнсаў. Трэцяя сусветная».
**13.00** Капейка ў капейку.
**13.35 Серыял «Шчаслівыя разам».**
**15.20** Анімацыя для ўсёй сям'і. «Хортан».
**16.50** «Арол і рэшка. Шопінг». Стайл-шоу.
**17.45 Баявік «Іншапланетнае ўварванне: бітва за Лос-Анджэлес».**
**19.50** «Панаехалі». Рэаліці-шоу.
**21.10 Выбар гледачоў. Камедыя «Падарожжы Гулівера».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**23.00** «Арол і рэшка. Нязведаная Еўропа». Трэвел-шоу. Выпуск № 1.
**0.05 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 12.45, 18.05, 23.50** «Калейдаскоп».
**8.15, 18.20 «Сказ пра тое, як цар Пётр арапа жаніў». Меладрама.**
**9.55** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**10.25 «На шляху ў Берлін». Драма.**
**11.55** «Нябачны фронт». Ленд-ліз.
**13.00** «Запаведнай сцежкай». Заказнік «Цікіны астравы».
**13.25 «Спадарожнік планеты Уран». Фантастыка.**
**15.00** «Наступны прыпынак... Месяц». Навукова-папулярны фільм.
**15.45 «Адпачынак у верасні». Трагікамедыя. 1-я і 2-я серыі.**
**20.00** Леанід Млечын прадстаўляе. «Сусветныя таямніцы». «Смерць артыста». Дак. фільм.
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Дазвольце расказаць...» Народная артыстка СССР Ада Рогаўцава.
**21.15 «Ноч святога Лаўрэнція». Драма.**
**23.00** «Дыліжанс-джаз». «Успамін пра лета».

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.35** Сучаснае пяцібор'е. Кубак свету.
**8.05** Тэніс. Турнір ВТА. Ухань. Фінал.
**10.10** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**10.40** Піт-стоп.
**11.10** Фактар сілы.
**11.45** Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі. «ФК Віцебск» — БАТЭ (Барысаў).
**13.35** Сэлфі.
**13.55** Футбол. На шляху да ЧС-2018. Відэачасопіс.
**14.25** Хакей. КХЛ. «Сібір» (Новасібірск) — «Дынама» (Мінск).
**16.50** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**17.25** Валейбол. Кубак Перамогі.
**19.30** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**19.55** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Порту» (Партугалія) — БГК імя Мяшкова (Беларусь).
**21.35** Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. 1/2 фіналу.
**23.40** PRO спорт. Навіны.
**23.50** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Ідэальны рамонт».
**12.10** «Разумніцы і разумнікі».
**12.55** Рэаліці-шоу «Аўтобус».
**13.25 Камедыя «Формула кахання».**
**15.10** «Следства пакажа».
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Тэорыя змовы».
**17.30 Серыял «Серафіма Прыгожая».**
**21.05** «Сёння вечарам».
**22.45** «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Летні кубак у Сочы-2015.
**1.00 Камедыя «Аўтара! Аўтара!»**

### СТБ

**6.30 Маст. фільм «Кромвель».**
**8.45** «Анфас».
**9.00** «Тайны свету».
**10.00** «Іншая краіна». «Арменія: дзяржава з вытрымкай».
**10.45** «Дарагая перадача».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.40 Серыял «Салдаты 5».**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40, 23.15 Маст. фільм «Парыжскія тайны».**
**15.35** «Глядзець усім!»
**15.55** «Вялікі горад».
**16.40** «Наша справа».
**16.55** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**17.20 Маст. фільм «Смяротная зброя 4».**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Маст. фільм «Сцірацель».**
**22.15** «Дакументальны праект»: «Анёлы-ахоўнікі».
**1.00** «Масква. Дзень і ноч». Заключныя серыі.

### МІР

**6.00, 8.40** М/ф.
**8.10** «Саюзнікі».
**9.00** «Ой, мамачкі!»
**9.30, 5.30** «Няма праблем».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Зроблена ў СССР».
**10.45 Маст. фільм «Набожная Марта».**
**13.40 Маст. фільм «Мальер».**
**16.15 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу».**
**18.15 Серыял «Скліфасоўскі 2».**
**0.30** «Культпрасвет».
**1.15 Серыял «Валандэр».**
**3.05** Дак. фільм «З нагоды. Па мянушцы Масгаз».
**3.55 Маст. фільм «Таямнічы востраў».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Пакой смеху».
**7.35 Маст. фільм «Дзеля цябе».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Правілы руху».
**12.00** «Гэта мая мама».
**12.45, 14.15 Маст. фільм «Тры таполі» на Плюшчысе».**
**14.35 Маст. фільм «Час збіраць».**
**16.20** «Эдзіта П'еха. Рускі акцэнт».
**17.10 Маст. фільм «Каханне да запатрабавання».**
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.40** «Галоўная сцэна».
**23.00 Маст. фільм «Шанц».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 8.20 Дэтэктыў «Адвакат».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**9.25** «Справа густу».
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.00** «Кулінарны пядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Я худзею!»
**14.15, 16.20 Серыял «Час Волкава».**
**18.05** «Следства вялі...»
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.00** «Новыя рускія сенсацыі».
**20.55** «50 адценняў. Бялова».
**21.55** «Ты не паверыш!»
**22.55** «Час Г».
**23.30 Маст. фільм «Двое».**

### 8 КАНАЛ

**9.00, 13.50, 19.05, 21.00, 23.25** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**9.25 Серыял «Мушкецёры».**
**10.25, 11.40, 15.55, 17.20** «Хатняя крама».
**10.40** «Хобі TV».
**11.30** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.55 Драма «Каралева ракі».**
**13.55 Камедыя «Класны мюзікл».**
**15.30** Мультпарад.
**16.00** «Адшукваецца адпачынак.
**16.30 Серыял «Альф».**
**17.30 Баявік «Цяжкая мішэнь».**
**19.10 Драма «Дрэйф».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Фантастыка «Людзі Ікс. Дні мінулай будучыні».**

### ВТБ

**6.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**7.00, 3.30** «Лаві момант».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**7.45** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.00** «Ералаш».
**9.00** Серыял «Вароніны».
**10.00, 1.00** «Турбаміксер».
**12.00** Камедыя «Адпетыя махляры».
**14.10, 22.40** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.30** «Вялікая маленькая зорка».
**15.30, 5.00** Серыял «Сваццi».
**17.30** «Уральскія пельмені».
**19.00** Серыял «Апошні з Магікян».
**20.30** Трылер «На мяжы».
**23.00, 4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**23.30** «Дзікія гульні».
**4.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.05** «9 дзён аднаго года». Маст. фільм.
**11.55** Вялікая сям'я. Алена Камбурава.
**12.50** Пернікавы домік. «Узорнае вязанне».
**13.20** «На гэтым тыдні... 100 гадоў назад. Нефрантавыя нататкі».
**13.50** Спектакль Александрынскага тэатра «Рэвізор». Рэжысёр Валерый Фокін.
**16.05** Да 60-годдзя Леаніда Дзясятнікава. «Лінія жыцця».
**17.00** Навіны культуры.
**17.30** «Аляксандр Збруеў. Мужчынская размова». Дак. фільм.
**18.10** «Мой малодшы брат». Маст. фільм.
**19.50** Выдатныя пісьменнікі Расіі. Давід Самойлаў. Сустрэча ў Канцэртнай студыі «Астанкіна». Запіс 1977 года.
**21.30** «Рамантыка рамансa». Яўгену Мартынаву прысвячаецца...
**22.25** «Белая студыя».
**23.10** Кіно на ўсе часы. «Дыржор». Маст. фільм.
**0.55** Мы і яны. «Мядзведжыя гісторыі». Дак. фільм.
**1.50** «Дару табе зорку». М/ф для дарослых.
**1.55** «Шукальнікі». «Невядомы рэфарматар Расіі».
**2.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. Госць: Алена Рэшатняк. 2007 год.
**6.50, 8.25, 9.40, 11.00, 13.00, 14.35, 15.40, 17.00, 19.00, 19.50, 23.10, 0.55, 2.30, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.10** Маст. фільм «Ніна».
**8.45** М/ф «Як вожык і медзведзяня мянялі неба».
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00, 18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1982. Паўтор ад 2011 года.
**13.15** Маст. фільм «Вэртанне з арбіты».
**14.50** М/ф «Калі падаюць зоркі».
**16.00** «Колба часу».
**19.20** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Раман Карцаў.
**20.50** М/ф «Восеньская рыбалка».
**21.00** «Быў час». 2008 год.
**22.00** Маст. фільм «Аўтапартрэт невядомага».
**0.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. Госць Коля Васін. 2008 год.
**1.15** Маст. фільм «Над намі Паўднёвы крыж».
**2.45** М/ф «Залатое кураня».

### EUROSPORT

**4.00, 8.00, 10.30, 18.30** Веласпорт. Чэмпіянат Еўропы па трэкавых велагонках.
**6.00, 9.30, 13.30, 21.30, 3.00** Тэніс. Турнір WTA.
**23.15** 1 Баявыя майстэрствы. Кароль каралёў.
**1.00** Футбол. Кубак свету. (U-17). Бразілія — Паўднёвая Карэя.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 17.35, 22.00, 3.20** Серыял «Былыя».
**6.45** Камедыя «Кекс у вялікім горадзе».
**8.25** Камедыя «Домік у сэрцы».
**10.45** Камедыя «Круты татачка».
**12.30** Камедыя «Закаханы да непрытомнасці».
**14.00, 19.45, 22.50, 0.55** Скетчком «Паміж намі».
**14.20** Камедыя «Спатканне ўсляпую».
**16.00** Камедыя «Сведка на вяселлі».
**18.20** Камедыя «Чалавек-эльф».
**20.20** Камедыя «Два калядныя сабакі».
**23.10** Камедыя «Джунглі клічуць! У пошуках Марсупіламі».
**1.15** Камедыя «Усмешка Бога, або Чыста адэская гісторыя».
**4.05** Камедыя «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.15** «Дачныя гісторыі».
**10.40** «Сто пытанняў даросламу».
**11.30** «Рокіно».
**11.40** «Хронікі маскоўскага побыту».
**12.30** «Доказ віны».
**13.05, 0.40** Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
**17.10** М/ф «Рыа».
**18.40** «Лінія абароны».
**19.15** Маст. фільм «Любіць нельга забыць».
**21.05** Маст. фільм «Місія: невыканальная».
**23.10** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».
**4.15** Дак. фільм «Я і мая фобія».
**5.35** «Лінія абароны».

### ТБ1000

**6.30** Драма «10 крокаў да поспеху».
**7.55, 3.10** Меладрама «Двухсотгадовы чалавек».
**10.05** М/ф «Воблачна, магчымы ападкі ў выглядзе фрыкадэлек».
**11.40** Драма «Розум і пачуцці».



**13.55** Драма «Лепшая прапанова».
**16.05** Фэнтэзі «Цудоўныя стварэнні».
**18.10** Камедыя «Хацеў бы я быць тут».
**20.00** Трылер «Урачысты фінал».
**21.40** Камедыя «Даю год».
**23.20** Жахі «Жанчына ў чорным».
**1.10** Баявік «Прафесіянал».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Дэтэктыў «Дзесяць негрыцянят».
**8.55** Камедыя «Адзінокі па кантракце».
**10.50** Фантастыка «Цяжка быць Богам».
**13.10** Драма «Гутарка».
**14.40** Драма «Андэрсан. Жыццё без кахання».
**17.10** Камедыя «Вось гэта каханне!»
**18.50** Камедыя «Прывітанне, я ваш тата!»
**20.20** Драма «Карасі».
**22.10** Меладрама «Аднойчы».
**0.00** Камедыя «Змяшаныя пачуцці».
**1.30** Трылер «Стальны матылёк».
**3.20** Меладрама «Вернасць».
**4.55** Меладрама «Унук Гагарына».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**6.50, 8.10** Гульні розуму.
**7.15** Навуковыя недарэчнасці.
**7.40** Зрабі або памры.
**9.20** Золата Юкана.
**10.10** Панарама 360.
**11.00** Больш чым фокусы.
**11.50** Космас: Прастора і час.
**12.40** Мегазаводы.
**13.30** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**14.20** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**15.10** У пошуках марскога сунердрапежніка.
**16.00** У аб'ектыве: незвычайныя паводзіны жывёл.
**16.50** Сутыкненне з астэроідам.
**17.40** Пагоня за леднікамі.
**18.30** Асушыць акіян.
**20.10** Праект: Дыназаўр.
**21.00, 1.10, 4.30** 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
**21.50, 2.00, 5.15** 2000-я: час, калі мы ўбачылі ўсё.
**22.40** Секунды да катастрофы.
**23.30** Землетрасенне на Эверэсце.
**0.20, 3.40** Наступнае мегацунамі.
**2.50** Карставыя варонкі.
**3.40** Наступнае мегацунамі.

### DISCOVERY

**8.00, 15.15, 2.00, 6.25** Махінатары.
**8.50** Дарожныя каўбоі.
**9.45** Смяротны ўлоў.
**10.40** Буйны ўлоў.
**11.35** Гаражнае золата.
**12.30, 0.00** Склады.
**13.25** Паляўнічыя на рэліквіі.
**14.20, 3.00** Хуткія і гучныя.
**16.10, 1.00, 5.38** Вулічныя гонкі.
**17.05, 4.50** Космас навыварат.
**18.00, 4.00** Як уладкаваны Сусвет.
**19.00** Чалавек і Сусвет.
**20.00** Глядзі ва ўсе вочы.
**23.00** Уцячы ад пагоні.
**7.13** Праз магію да зорак.

# МІТУСНЯ ВАКОЛ АЙФОНА

**Традыцыйна раз на год або каля таго даволі вядомая кампанія з «фруктовым» лагатыпам выпускае новую мадэль, мабыць, самага вядомага смартфона сучаснасці. Каштуе ён нямала і ў першую чаргу служыць доказам «крутасці» свайго гаспадара. У пагоні за гэтай дарагой цацкай (новы iPhone 6s каштуе звыш 1000 долараў) ва ўсім свеце людзі часта страчваюць розум.**

### НЫРКУ СЯБРА НЕ ШКАДА

Жыхар кітайскага горада Янчжоу адважыўся на продаж ныркі дзеля набыцця iPhone 6s. Прычым ідэю мужчыну па прозвішчы У падказаў яго сябар Хуань. Юнакі знайшлі ў інтэрнэце агента, які займаўся незаконным набыццём органаў. Той папрасіў У прайсці медыцынскі агляд у бальніцы горада Нанкін. Там жа яны павінны былі ўбачыцца з агентам, але той не прыйшоў. Пасля гэтага У перадумаў прадаваць нырку, але «сябар» не захацеў адмяняць здзелку, і У звярнуўся ў паліцыю. Супрацоўнікам праваахоўных органаў не ўдалося адразу затрымаць Хуаня.

### Я СТАЯЛА!

Аўстралійка Люсі Кэлі выправіла да крамы ў Сіднеі робата, каб адной з першых купіць новы гаджэт. Робат уяўляе з сябе планшэт iPad, далучаны да прылады, якая нагадвае сегвей. Пры дапамозе адмысловага дадатку Кэлі кіравала ім і нават мела зносіны з навакольнымі праз камеру і мікрафон. Па задумцы аўстралійкі, робат замест яе павінен быў прастаяць ноч перад купляй, потым заехаць у краму і пад яе кіраваннем купіць новы тэлефон. Людзі ў чарзе даволі цёпла ўспрынялі незвычайнага пакупніка, актыўна з ім размаўлялі і рабілі сэлфі. Ці здзейснілася задумка гультаяватай і знаходлівай аўстралійкі, не ўдакладнялася.



### ДЛЯ БАГАЦЕЯЎ

Італьянская кампанія Caviar, якая спецыялізуецца на аздабленні мабільных тэлефонаў, выпусціла новую калекцыю на базе iPhone 6s. Лінейка атрымала назву Atlante і прысвечана краінам свету. У калекцыі прадстаўлены некалькі мадэляў, кожная з іх упрыгожана сімволікай адной з краін: Расіі, Італіі, Кітая, ААЭ, Азербайджана, Казахстана і Арменіі. У мадэляў лінейкі панэль выканана з золата і дапоўнена барэльефамі з вывавай славутасцей і сімволікай краін. Кошт такіх смартфонаў 2,3 — 3,3 тысячы долараў.



### А ДАВАЙЦЕ Я ЯГО СТУКНУ...

Баец змешаных баявых мастацтваў амерыканец Люк Рокхалд наогул арганізаваў новым айфонам краш-тэст. Ён выбіваў смартфоны нагой з рук памочнікаў, ад чаго дэвайс адлятаў у сцэну. Ад падобных «тэстаў» прылады, зразумела, разляталіся на часткі. Таксама Рокхалд зрабіў ім тэст на згінанне. У выніку высветлілася, што для 6s Apple нездарма абрала алюміній серыі 7000 у якасці матэрыялу корпуса. Сагнуць гаджэт байцу ўдалося з вялікай цяжкасцю, а восьмь 6-ка зламалася лёгка.






## МУХА Ў ЭЛЕКТРЫЧНЫМ ПОЛІ

Пытанне на засыпку: ці ведаеце вы, што такое тытан? Не хто такі, а менавіта што такое?

Для людзей больш маладога веку патлумачу: тытан — гэта воданагравальны агрэгат, які награваецца дровамі ці брыкетам і, пры адсутнасці цэнтральнага ацяплення, абагравае жытло. Абаграває, трэба сказаць, да пары, бо нішто ж не вечна пад месяцам. У майго калегі, напрыклад, у гэтым самым тытане прагарэла неяк рашотка, на якую складваюць дровы, — трэба было шукаць новую. А дзе?

Барыса хоць на нейкі час, але выручыла прыродная мужыцкая кемлівасць. Рэч у тым, што ў нашым жа будынку на першым паверсе знаходзілася тэлевізійная майстэрня, і з яе работнікамі мы былі ў добрых суседскіх адносінах — адзін аднаго выручалі, заходзілі ў госці.

Падчас такога візіту вочы майго калегі і ўгледзелі металічную накрыўку да самай вялікай лямпы ў лямпавым ка тэлевізарах (былі такія, калі хто забыўся). А яна, тая накрыўка, і сапраўды нагадвала рашотку, бо спрэс была ў невялічкіх дзірачках, каб да лямпы праходзіла паветра і тая, адпаведна, не перагравалася.

Узрадаваўся калега: дык гэта ж тое, што трэба! Выпрасіў, прынёс у кабінет, паклаў на стале, разглядае...

У гэты час заходзіць у пакой яшчэ адзін наш супрацоўнік, пытае:

— Барыс, а што гэта за цацка?

— Ды ведаеш, брат, гэта...

(Калега думаў, а таму і марудзіў.)

— Гэта... мухалоўка!

Ад здзіўлення ў мяне, што называецца, адвісла сківіца, але ж Барыс таго не бачыў, бо толькі што народжаная ім «ідэя» чакала свайго развіцця:

— Бачыш гэтыя дзірачкі? — пачаў тлумачыць ён. — Дык вось, ставіш рашотку ў акно, і ўсе мухі, што імкнуцца да цябе ў пакой, гінуць.

— З чаго б гэта? — не верыць госць.

— Элементарна, Ватсан! Да гэтай рашоткі падключаецца батарэйка. З яе дапамогай ствараецца электрамагнітнае поле, і калі якая кузурка ў яго трапляе, ёй адразу ж капут. Зразумеў?

— Ну дык, само сабой, — адгукнуўся госць, хоць на твары было напісана, што ўсе тлумачэнні для яго цёмны лес. — Добрая прылада. А дзе ты ўзяў?

— У тэлемайстэрні... Падыдзі да хлопцаў, можа, і табе за бутэльку ўступяць?

...Недзе праз паўгадзіны наш візіцёр зноў з'явіўся ў кабінеце — ужо з... «мухалоўкай»:

— Вось, — сказаў, — далі. За бутэльку...

Вечарам пасля працы Барыс з тэлемайстрам яе раздзялілі. І мне крыху перапала. Як сведку.

**А. П.**

*г. Беразіно.*

## ВОСЬ ТАКІ... БЛІН

Кожны раз, прачытаўшы чужыя «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі», мы з мужам збіраліся расказаць сваю. Нарэшце прыйшоў час.

Пачаць трэба з таго, што вырасла я ў досыць незвычайнай сям'і. Мой бацечка ўсё жыццё выкладаў у школе хімію, мама — беларускую мову і літаратуру. Удваіх, на пару, фізік і лірык, яны дагэтуль могуць гадзінамі чытаць вершы, пад настрой і на два галасы вельмі хораша спяваць. Абое любяць музыку, усім цікавяцца, шмат чытаюць...

А яблычак ад яблынькі недалёка падае. Мае аднакласніцы ўжо ва ўсю падкручвалі спаднічкі, каб карацейшыя былі, фарбавалі пазногці, шапталіся пра хлопчыкаў і нават круціці з імі раманы, а я ўсё чытала кніжкі ды лунала ў аблоках. Ва ўсялякім разе думкі не дапускала, што магу сустракацца з кімсьці не такім разумным і прыгожым, як мой тата, што пасябрую з хлопцам, які будзе хадзіць у брудным абутку ці пакамечанай кашулі, што ад яго можа патыхаць цыгарэтамі альбо перагарам. Пра брыдкаслоўе, мусіць, і казаць не варта: мяне да глыбіні душы абражала нават прамоўленае некім слова «блін», бо тата неяк сказаў, што яго ўжываюць замест іншага — на гэтую ж літару...

Вось так я пражыла амаль да 20 гадоў. Магчыма, і пазней не спусцілася б на зямлю з аблокаў, калі б не стала хварэць мама, калі б яна пры кожнай сустрэчы не пачала казаць, што мне трэба звяртаць увагу на хлопцаў, прыглядацца да іх ды выходзіць замуж, а то яна, крый Божа, памрэ, так і не дазнаўшыся, з кім я звяжу свой лёс... Ну і гэтак далей...

Гэта маміна трывога і прымусіла мяне прызямліцца, хоць не адразу, але ж знайсці сабе сябра-хлопца, з якім разам гулялі на вяселлі: ён — з боку жаніха, я — з боку нявесты. Мы з ім абмяняліся тэлефонамі, ён часцяком стаў пазвоньваць, сустракаць мяне з заняткаў, запрашаць на каток, на розныя канцэрты і спектаклі, у кіно. Ён не курыў, вельмі акуратна апранаўся, з ім заўсёды было пра што пагаварыць і з чаго пасмяяцца...

Пра гэта я, вядома ж, расказвала дома сваім бацькам, Сяргей — сваім. Яго сям'я хацела пазнаёміцца са мной, мая — з ім. Таму, узяўшыся за рукі, мы ўжо бегалі па крамах у пошуках цікавых падарункаў, бо не з пустымі ж рукамі ўпершыню прыходзіць у хату...

Мы ўжо нават вырашылі, што пачнём з маіх бацькоў. А напярэдадні...

Сорам прызнавацца, амаль тры гады правучыўшыся ў Мінску, я ні разу не была ў Батанічным садзе. Сяргей паабяцаў звадзіць. Ён сустрэў мяне ля ўвахода ў метро на станцыі Кастрычніцкай. Разам мы спусціліся да кас — ён купіў жэтонаў, даў мне. Я першай прайшла праз турнікет, хлопец крочыў следам. Прынамсі павінен быў, але...

За спіной у мяне штосьць гучна бразнула.

— Блін... — гучна сказаў чамусь затрыманы турнікетам Сяргей.

І ўсе людзі, што былі паблізу (як мне падалося) павярнулі галовы — сталі глядзець на яго, на мяне, закаханую дурніцу, якая паверыла, што гэты хлопец не такі, як іншыя, што ён выключны... А, высвятляецца, не!

Гэта «адкрыццё» сарвала мяне з месца, прымусіла пабегчы, паспець у апошні вагон і паехаць.

Сяргей — бачыла — кінуўся даганяць, не дагнаўшы, — адразу ж стаў абрываць тэлефон, але я выдаліла яго кантакт...

Пазваніла тату, папрасіла, каб сустрэў з электрычкі. Ён ніяк не здзівіўся, бо рабіў гэта заўжды.

І вось я прыехала, адчыніла дзверцу яго машыны, села...

Усё астатняе адбылося ў лічаныя імгненні: тата завёў машыну, крануўся з месца, спытаў:

— Дык чаму без Сяргея?

— З ім усё скончана, — адрэзала я.

— Во блін! — раптам сказаў мой тата(?!) і, відаць, знячэўку націснуў на тормаз. Факт, што я, не паспеўшы прышпіліцца, стукнулася галавой у лабавое шкло і (вы не паверыце!) сказала... тое ж.

Пасля гэтага наша машына хвілін з дзесяць стаяла пасярод дарогі. Мы з татам, здаецца, ніколі так не смяяліся — да ікаўкі, да слёз...

Што далей было, расказваць, мусіць, і не варта. Я неяк здолела набраць тэлефон Сяргея, праз смех сказала яму, у колькі адпраўляецца чарговая электрычка, з якой мы з татам яго будзем чакаць. Заінтрыгаваны такім перападам у маім настроі, ён, вядома ж, прыехаў. І вельмі спадабаўся маім бацькам, а я потым — ягоным. Праз паўгода мы распісаліся.

З таго дня прайшло амаль 15 гадоў. У нашай сям'і падрастаюць дзве дачушкі. Дзве дзядулі і дзве бабулі (за што ім шчыры дзякуй!) дапамагаюць іх гадаваць. Хоць ужо і не такімі рамантычнымі, як некалі мяне. Ці, дакладней, нас з мужам.

**А. Б.,**

*г. Барысаў.*

## БОЙКА З ЦЫВІЛІЗАЦЫЯЙ

Старонка гісторыі: у 1953 годзе ў нас за грошы калгаса быў набыты радыёвузел. Людзі дружна сталі купляць дынамікі і чакаць, калі ж скончыцца мантаж абсталявання, калі тыя чорныя «талерачкі» нарэшце загавораць? Ці не кожны хацеў пачуць іх першым. Але ж не ўсё тое збываецца, на што чалавек спадзяецца: момант гэты ці не ўсе прапусцілі, бо падключэнне адбылося недзе ў канцы лета, а час гэта вельмі гарачы: хто не ў полі быў, той на лузе. У вёсцы засталіся хіба малыя ды зусім старыя.

Бабцы Хадорцы, напрыклад, ногі дужа балелі, чула слаба ды і не бачыла ўжо некалькі гадоў. Таму ў добрае надвор'е яна з ранку сядзела на двары каля сцяны, драмала...

А тут раптам чуе — нехта загаманіў... І досыць моцна...

Бабцы здалося, што ў двор зайшлі цыганкі.

— Вазьміце сабе груш з кошыка ды ідзіце адсюль, — скамандавала ім гаспадыня.

Аднак «цыганкі» не паслухаліся: яны працягвалі пра нешта гаварыць, а потым, набраўшыся нахабства, нават песню нейкую зацягнулі!

— Сціхнеце! — закрычала бабуля. — І без вас галава трашчыць...

Тыя — каб падумалі!

Тады старая намацала побач свой кій, паднялася, зрабіла некалькі крокаў у той бок, адкуль ішла гамонка, і ў апошні раз, што называецца, дабром папрасіла:

— Людцы, ідзіце з хаты, а то...

Не паслухалі, не пайшлі! Горш за тое — гучна аб'явілі:

— А зараз прагучыць песня з цыкла...

— Якая яшчэ «сцыкла»?! — закрычала старая і давай размахваць кіем.

Махала яна доўга, аж пакуль не трапіла па той чорнай талерцы, што вісела ў куце, аж пакуль тая прылада, адарваўшыся ад сцяны, не ляснула аб падлогу і нарэшце не сціхла.

Бабка Хадорка была задаволена: як-ніяк выгнала тых чужаніц з хаты, задала ім перцу з імберцам — болей наўрад ці сунуцца!

А таму яна зноўку паклыпала ў двор, зноўку прысела на лаўку, прыхілілася да сцяны. Падумала яшчэ, што як ні круці, а стары чалавек у хаце таксама патрэбен! Вось не было б яе дома, дык гэтыя ж прыхадні са сваімі песнямі ўсё пакралі б!.. А так пашумелі, галаву падурылі ды і пайшлі сабе. Ужо, мусіць, далёка, раз галасоў не чуваць? Значыць, ёй можна разняволіцца ды і падрамаць — вось тут, на сонейку.

**Уладзімір ПУГАЧ,**

*аграгарадок Навасёлкі, Петрыкаўскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

*dounar@zviazda.by*

# Самае пачэснае званне

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Так, памер аднаразовай дапамогі ў сувязі з нараджэннем дзіцяці ў нас за апошнія пяць гадоў павялічыўся больш як у 10 разоў і з'яўляецца самым высокім у краінах ЕАЭС. Ён складае 15 млн 691,3 тыс. рублёў на першае дзіця, а на другое і наступных дзяцей — 21 млн 967,8 тыс. рублёў. Для параўнання: у Расіі памер аднаразовай дапамогі на першае дзіця ў пераліку на беларускія рублі роўны 3 млн 791,2 тыс. рублёў, у Казахстане — 4 млн 291,2 тыс. рублёў.

У перыяд догляду дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў памер дапамогі ў нашай краіне складае 35-40% сярэдняга заробку па краіне, прычым незалежна ад таго, застрахаваная жанчына ці не. Акрамя таго, на дзяцей ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў у перыяд выхавання дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў сям'я з гэтага года можа атрымаць новую дапамогу, памер якой складае 50% бюджэту пражытковага мінімуму, што складае 784,6 тыс. рублёў.

**За мінулы год у Беларусі нарадзілася больш за 118 тысяч дзяцей — гэта самы высокі паказчык за апошнія 20 гадоў.**

Усяго сістэмай дзяржаўных дапамог ахоплена больш за 537 тыс. дзяцей. Аб'ём сродкаў, што накіроўваюцца на фінансаванне сістэмы дапамог, летась склаў 1,7% ВУП.

* * *

З 1 студзеня гэтага года стартавала новая праграма доўгатэрміновай падтрымкі шматдзетных сем'яў — сямейны капітал. Сям'я пры нараджэнні (усынаўленні) трэцяга або наступных дзяцей набывае права на аднаразовае прадастаўленне безнаяўных грашовых сродкаў у памеры 10 тыс. долараў. У рамках гэтай праграмы з сакавіка па верасень 2015 года ў ААТ «АСБ Беларусбанк» адкрыта 6 790 дэпазітных рахункаў амаль на 68 млн долараў.

У Беларусі, паводле слоў Аляксандра Румака, сем'і могуць атрымаць шырокі комплекс сацыяльных паслуг. Так, у першым паўгоддзі гэтага года паслугі нянькі па сацыяльна нізкіх расцэнках атрымалі 1004 сям'і. Папулярнай з'яўляецца і паслуга сацыяльнай перадышкі для сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. Для сем'яў з нізкімі даходамі дзейнічае мэтавая праграма адраснай сацыяльнай дапамогі, якая ўключае пяць відаў падтрымкі.

Больш за 2/3 шматдзетных сем'яў ужо палепшылі свае жыллёвыя ўмовы. Дзейнічаюць ільготы ў сферы адукацыі. Аплата за харчаванне дзяцей ва ўстановах дашкольнай адукацыі для сем'яў, якія выхоўваюць дваіх дзяцей-дашкольнікаў, зніжаецца на 30%, для шматдзетных — на 50%.

***

**Дырэктар Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі Наталля ПАСПЕЛАВА** адзначае, што ўсё менш дзяцей маюць патрэбу ў такім выглядзе сацыяльнай абароны як усынаўленне. На яе думку, гэта абумоўлена поўнамаштабнай сістэмай падтрымкі сем'яў на розных этапах дзіцяча-бацькоўскіх адносін. «Той факт, што ўсынавіць дзіця да трох гадоў стала праблематычна, таксама сведчыць аб велізарнай увазе да дзяцінства кожнага дзіцяці, да мацярынства кожнай жанчыны», — упэўнена спецыяліст.

**У Беларусі ордэнам Маці ўзнагароджаны 8094 жанчыны, якія нарадзілі і годна выхавалі пяць і больш дзяцей.**

***

У 2016-2020 гадах вектар сямейнай палітыкі, паводле слоў Аляксандра Румака, будзе скіраваны на захаванне дасягнутых паказчыкаў нараджальнасці, на падтрымку сем'яў з дваімі і больш дзецьмі. Пры гэтым акцэнт будзе зроблены на развіццё ўмоў для больш гарманічнага сумяшчэння прафесійных і сямейных роляў бацькоў, павышэнне адказнасці і ступені ўдзелу мужчын у выхаванні і доглядзе за дзецьмі, выраўноўванне стартавых магчымасцей дзяцей з розных катэгорый сем'яў. Рэалізацыя гэтых задач запланавана падпраграмай «Сям'я і дзяцінства» дзяржаўнай праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека» на 2016-2020 гады.

**Святлана БУСЬКО.**

*busko@zviazda.by*

■ Відовішча

## ШЫКОЎНАЕ ПАЛЯРНАЕ ЗЗЯННЕ Ў БЕЛАРУСІ

**Уначы з 7-га на 8 кастрычніка па ўсёй Паўночнай і Цэнтральнай Еўропе можна было назіраць палярнае ззянне, паведамляе сайт Белгідраметцэнтра. Гульня святла ў небе была выклікана магутнай магнітнай бурай на Зямлі, якая працягваецца да гэтага часу.**




Бура выклікана праходжаннем Зямлі скрозь высакахуткасны паток сонечнага ветру ад прыэкватарыяльнай каранальнай дзіркі.

Палярнае ззянне ў Беларусі назіралася не толькі ў паўночнай і цэнтральнай частках краіны, яго было відаць і на шыраце 52 градусаў — у Гомелі, што здараецца даволі рэдка, адзначаюць спецыялісты.

**Сяргей ПАЛІНІН**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены по продаже имущества ОАО «Борисовхлебпром» (Продавец):**

**спецсооружение с инв. № 631/С-11334,**

**расположенное по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Интернациональная, д. 24б.**

Земельный участок площадью 1,0932 га с кадастровым номером 621350100007002288.

**Начальная цена с НДС – 183 312 000 бел. руб.**

**Задаток – 18 331 200 бел. руб. Шаг аукциона – 5%.**

*Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже спецсооружения ОАО «Борисовхлебпром»,* **проводимом 22 октября 2015 г.**

